ГАДЫЕ У ГАДЗ. НОЧЫ:

МАСКВА, 3. Прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў аслабаніць тав. Багамолава ад абавязкаў паўпрэда СССР у Польшчы ў сувязі з назначэньнем яго саветнікам паўпрэдзтва ў Вялікабрытаніі.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЯЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 277 (3385) Серада 4 сьнежня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ВОРША, (Наш кар.). Прэзыдыум акрвыканкому запрапанаваў праўленьню акржылсаюзу прадставіць 20 проц. жыльлёвай плошчы ўсіх дамоў жылсаюзу пад кватэры для начальніцкага складу; да гэтага часу начсклад у дамох жылкаапэрацыі займаў толькі 6 проц. усяе жыльлёвай плошчы. Што датычыць гаркамгасу, дык апошні ў новых дамох, якія ён зараз будуе, адводзіць 20 проц. жыльлёвае плошчы пад кватэры для начальніцкага складу.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731

Да ўсіх працоўнікоў друку

МАСКВА, 2. 18-га лістапада, абараняючы граніцу Савецкае рэспублікі ад нападу белакітайцаў, загінуў сьмерцю гэрояў тав. ВОЛІН, супрацоўнік газэты Далёка-Усходняй армії «Тревога». Тав. Волін сваёй сьмерцю закончыў абавязак савецкага журналістага ў баёх з клясавым ворагам. Сьмерць тав. Воліна павінна прыпамянуць усім працаўніком друку аб неабходнасьці ўзбройвацца вайсковымі ведамі, каб у будучай вайне, якую навяжа нам капіталістычны сьвет, пяро і вінтоўка савецкага журналістага з аднолькавай сакрушальнай сілай білі ворага.

Работнікі «Уральского Рабочего» адгукнуліся на сьмерць т. Воліна і ўзамен выбыўшага са строю камсамольца, паслалі рэдакцыі «Тревога» журналістага-камуністага, адначасова прыняўшы шэфства над «Тревогой».

Ухваляючы ініцыятыву «Уральского Рабочего», ЦБ заклікае ўсе рэдакцыйныя калектывы прыняць удзел у шэфстве. Разам з тым ЦБ напамінае аб стварэньні фонду вайсковага друку і заклікае ўсіх работнікаў друку ўсямерна ўзмацняць гэты фонд.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО СЭКЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ.

VI пленум ЦК УсеЛКСМ

МАСКВА, 2. Адкрыўся VI пленум ЦК УсеЛКСМ.

У дакладзе аб выніках работы і задачах камсамолу ў справе індустрыялізацыі краіны і рэконструкцыі сельскае гаспадаркі сакратар ЦК тав. Касараў радам лічбаў і фактаў ілюстраваў вялізарнае дасягненьне камсамолу ў гаспадарчым будаўніцтве, асабліва ў справе разгортваньня сацспаборніцтва і арганізацыі руху ўдарных брыгад. Хваля сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнай работы, якая пачалася ў нэтрах камсамолу, дакацілася да самых глухіх куткоў. Зараз лёзунг камсамолу: — «Ад ударнай брыгады да ўдарнага цэху, ад ударнага цэху да ўдарнага заводу». Камсамол павінен стаць ініцыятарам стварэньня ўдарных прадпрыемстваў, узорных ва ўсіх адносінах, ва ўсіх бакох вытворчага і грамадзкага жыцьця данага заводу.

Да гэтага часу яшчэ сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарная работа вельмі рэдкае зьявішча ў вёсцы. Камсамол тут павінен націснуць на ўсе вагары. Ёсьць дзе прыстасавань камсамольскія рукі ў вёсцы. Адных трактарыстых пяцігодка патрабуе 200 тысяч. На жаль, да гэтага часу яшчэ мізэрны ўдзел камсамолу ў калгасным руху. Мы павінны будзем рашуча выключаць з камсамолу ўсіх тых, якія супрацьдзейнічаюць калектывізацыі. Камсамол павінен адыграць буйнейшую ролю ў падрыхтоўцы да перагадрыхтоўкі кадраў.

ЦК УсеЛКСМ парашыў арганізаваць перакідку ня менш 10.000 лепшых камсамольцаў у вугальныя раёны, 5.000—у жалезарудныя раёны, 3.000—у новыя машына-будаўнічыя і мэталя-заводы. Барацьба за якасьць і за аўладаньне тэхнікай — важнейшыя задачы камсамолу. Неабходна рашуча разгарнуць барацьбу за рацыяналізацыю.

Канчаючы даклад, т. Косараў гаворыць: «У сучасны момант дапамагаць партыі ў гаспадарчым будаўніцтве — гэта значыць змагацца за генэральную лінію партыі супроць правых і трацкістых. Гаспадарчыя пытаньні — гэта рашаючыя пытаньні, на вырашэньні гаспадарчых пытаньняў мы палітычна выхоўваем моладзь і даем камуністычны сьветапагляд.

ДАДАТКОВЫ ПРЫЁМ У ВТНУ 1.000 РАБОЧЫХ З ВЫТВОРЧАСЬЦІ

МАСКВА, 2. «Главтуз» рашыў правесьці ў студзені першы дадатковы прыём у ВТНУ 1.000 рабочых ад вытворчасьці. З прычыны таго, што новы прыём не забясьпечаны інтэрнатамі, будуць прыняты пакуль што толькі рабочыя маскоўскіх прадпрыемстваў.

ПАБУДОВА ЧЫГУНАЧНАЙ ВЕТКІ НА УРАЛЕ

ПЕРМ, 30. Адкрыўся рух на новай чыгуначнай ветцы Залежная-Нафта. Першы цягнік быў спатканы на станцыі Нафта тысячным натаўпам мясцовых сялян і рабочых. Ветка (даўжынёю ў 12 клм.) злучыла Чусаўскія нафтавыя промыслы з галоўнай лініяй Пермскай чыгункі.

АД НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ па ЗАМЕЖНЫХ СПРАВАХ

(НАЧНОЕ РАДЫЁ)

МАСКВА, 3. 1-га сьнежня ў г. Нікольск-Усурыйск прыбыў прадстаўнік мукдэнскага ўраду — дыплёматычны камісар Цай'Юнь-шэн у суправаджэньні члена праўленьня К.-У. чыг. Лі Шао-чэна для высьвятленьня з агэнтам НКЗС у Хабароўску т. Сіманоўскім працэдуры выкананьня 2-га пункту папярэдніх умоў савецкага ўраду, якія былі прыняты маршалам Чжан Суэ-лянам.

У выніку абмена думкамі абодвымі бакамі ад імя іх урадаў быў падпісан 3-га сьнежня пратакол. У пратаколе зазначаецца, што старшыня праўленьня К.-У. чыг. Люй зьмяшчаецца са сваёй пасады і што мукдэнскі ўрад строга будзе выконваць мукдэнскую і пэкінскую згоды ад 1924 г., як у цэлым, так і ў яго паасобных частках.

Учора, 3-га сьнежня, францускі пасол у Маскве Эрбэт уручыў тав. Літвінаву дзьве дэклярацыі — адну ад імя францускага, а другую — ад імя амэрыканскага ўрадаў. Адначасова нарвэзкі пасланьнік Урбі ўручыў тав. Літвінаву аналёгічную па зьместу заяву ад імя брытанскага ўраду. У гэтых дэклярацыях вышэй упамянутыя ўрады зьвярнуліся да савецкага ўраду з парадамі і ўказаньнямі адносна спосабу ўрэгуляваньня спрэчных пытаньняў савецка-кітайскага канфлікту.

На гэтыя дэклярацыі тав. Літвінаў ад імя Саюзнага ўраду перадаў францускаму, амэрыканскаму і ангельскаму ўрадам адказ, у якім СТАНОЎЧА АДХІЛЯЮЦЦА спробы гэтых урадаў аказаць нацiск на савецка-кітайскія перагаворы з мэтаю перашкодзіць МІРНАМУ ЎРЭГУЛЯВАНЬНЮ савецка-кітайскага канфлікту.

Імпэрыялістыя не пакідаюць думкі аб умяшальнасьці ў савецка-кітайскі канфлікт

СТЫМСОН „ЗА РАБОТАЮ"

ВАШЫНГТОН, 2. Дзяржаўны сакратар Стымсон і іншыя чыноўнікі дзяржаўнага парляменту (міністар замежных спраў), якія маюць дачыненьні да пытаньняў палітыкі ў Манчжурыі, працавалі і ў нядзелю ў міністэрстве. Гэта зусім незвычайнае зьявішча. Характар заняткаў трымаецца ў строгай таямніцы. Да гэтага часу невядома, што за прапануюць ПАЗШ дзяржавам і ці зробяць яны якія-небудзь прапановы.

НАНКІНСКІЯ ДЫПЛЁМАТЫ ЦЕШАЦЬ СЯБЕ УМУШАЛЬНАСЬЦЮ ДЗЯРЖАЎ

ТОКІЁ, 1. Як падае агэнцтва «Сін-Бун-Рэнга» з Нанкіна, таварыш міністра замежных спраў нанкінскага ўраду Чан Во-хуа заявіў, што згодна данясеньня кітайскіх пасланьнікаў, у працягу 10 дзён Ліга Нацый, а таксама дзяржавы, якія падпісалі пакт Кэлёга, зьвернуцца з пратестам да савецкага ўраду, «што будзе мець сур'ёзныя вынікі».

АДСТАЎКА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ НАНКІНА

ТОКІЁ, 3. Увесь друк падае весткі з Нанкіна аб тым, што Ван Чжэн-цін падаў у адстаўку, узяўшы на сябе адказнасьць за правал кітайскай дыплёматыі ў савецка-кітайскім канфлікце.

АЖЫЎЛЕНЬНЕ Ў ЭКАНАМІЧНЫХ КОЛАХ МАНЧЖУРЫІ

ТОКІЁ, 1. З Харбіна падаюць, што вестка аб абмене нотамі паміж Мукдэнскім і Савецкім урадамі выклікала там вялізарнае ажыўленьне ў эканамічных колах. Курс кітайскага доляру ўзьняўся.

У бела-эміграцкіх колах і ў кіраўніцтве К.-У. ч. вестка аб згодзе Мукдэна на савецкія патрабаваньні выклікала замяшаньне.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ВЕНСКІХ РАБОЧЫХ У ГОНАР ДАЛЁКА-ЎСХОДНЯЙ

ВЕНА, 2. Учора ў Вене адбыўся скліканы кампартыяй і «Т-вам прыцеляў Савецкага Саюзу» масавы сход з прычыны прыезду з СССР жаночай рабочай дэлегацыі, якая езьдзіла на Кастрычніцкія ўрачыстасьці. Даклад дэлегатак з апісаньнем посьпехаў рэалізацыі пяцігодкі выклікаў натхнены водгук пралетарскай аўдыторыі. Сход вылыўся ў рэвалюцыйную маніфэстацыю венскіх рабочых у гонар Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі, якая дала суровы адпор кітайскім налётчыкам.

У Заходняй Украіне

СТАН АБЛОГІ

ЛЬВОЎ, 28. У сувязі з пажарам у мястэчку памешчыка Штольца ў Азяранах і замахам на старосту, у гэтым раёне ўведзены стан аблогі. Улады зрабілі шмат вобыскаў і арыштавалі 8 чал. У сяле Жашкове, Львоўскага павету, зроблены вобыск у «Просьвіце» і ў кааперативе, а таксама сярод сялянства. Два чалавекі арыштаваны.

ПРЫСУД НАД КАМУНІСТЫМ

ЛЬВОЎ, 28. Суд фашысцкай Польшчы прыгаварыў да 8 месяцаў турэмнага зьняволеньня 17-гадовага камуністага Самсона Мантля. Улада абвінавацілa яго ў тым, што ён выступіў перад рабочымі з прамовай супроць ураду і быцьцам ён распаўсюджваў лістоўкі КПЗУ.

УЗНАГАРОДА ДУШЫЦЕЛЮ

ВАРШАВА, 28. Польскі ўрад узнагародаіў вышэйшай узнагародай—камандорскім крыжам валынскага ваяводу Юзэфскага, вядомага сваімі антысавецкімі выступленьнямі. Пятлюраўская газэта «Украйньска Ніва» з гонарам заяўляе, што на пасяджэньні ваяводзкай рады, дзе Юзэфскаму была дадзена ўзнагарода, былі таксама украінцы.

Эканамічны крызіс у ПАЗШ паглыбляецца

НЬЮ-ЁРК, 2. Наперакор аптамістычным заявам Гувэра на канфэрэнцыі з прадстаўнікамі дзеларова сьвету, крызіс у ПАЗШ працягваецца. Чыгуначныя перавозкі працягваюць падаць. Зьмяншэньне вытворчасьці сталя-ліцейнай і аўтамабільнай прамысловасьці таксама працягваецца. Паводле паведамленьня дэпартаманту гандлю прамысловая прадукцыя ў кастрычніку ніжэй чым у верасьні гэтага году. Прамысловы індэкс фэдэральнага рэзэрвовага банку зьнізіўся з 144 у кастрычніку 1928 г. да 122 у верасьні і да 117 ў кастрычніку 1929 году.

На 2-й сасіі ЦВК СССР

Кантрольныя лічбы 1929-30 г.

Галоўнаю парукаю ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў больш кароткі тэрмін, чым гэта вызначалася—зьяўляецца мабілізацыя мас, рост іх актыўнасьці і згуртаванасьці

З дакладу тав. А. І. РЫКАВА на сэсіі ЦВК СССР

Даючы лічбовую характарыстыку некаторых бакоў таго вялізарнага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, які Саўнарком уносіць на зацьвярджэньне сэсіі ЦВК Саюзу, т. Рыкаў сказаў:

«Я думаю, што ўжо з паданых мною лічбаў ясна неўгрунтаванасьць супярэчаньняў, якія рабіліся ў Саўнаркоме з боку паасобных прадстаўнікоў з месц, што пры распрацоўцы бюджэту некаторыя літары закону ня былі захаваны. Мы выконваем пляны некаторых галін прамысловасьці ў тры гады, замест пяці, калектывізацыя вёскі ў тым абходзе, як гэта было вызначана Дзяржпляном к канцу пяцігодкі, будзе праведзена ў жыцьцё, магчыма, у бягучым годзе. Ажыцьцявіць такога грандыёзнага маштабу гаспадарчыя задачы так, каб ні адна літара з нашых бюджэтных узаконеньняў не пацярпела, не магчыма і я не бяруся гэта зрабіць. Пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтага гаспадарчага пляну азначае глыбокія ў параўнаньні з усімі папярэднімі гадамі вырухі ва ўсёй эканоміцы краю і ў клясавых адносінах на карысьць сацыялізму, і для гэтага варта патрывожыць некаторыя літары нашага фінансавага заканадаўства. Пераважная роля ў гэтым пляне захоўваецца цалкам і поўнасьцю за індустрыяй і, прыватнасьці, за цяжкай індустрыяй.

Характарызуючы вялізарны рост вырабу сродкаў вытворчасьці, тав. Рыкаў зазначае, што такія меркаваньні ў галіне індустрыі маглі быць зроблены толькі таму, што мінулы год даў нам хоць і ня зусім выстарчальныя, але ўсё-ж значныя вынікі на асноўных момантах работы—іменна: га прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту.

Як на адзін з алмоўных вынікаў мінулага году т. Рыкаў зазначае на тое, што якасьць прадукцыі па некаторых галінах прамысловасьці зьнізілася даволі рэзка. «Я павінен з усёю рашучасьцю заявіць,—гаворыць тав. Рыкаў,—што ў бягучым годзе мы ня толькі ня можам дапусьціць далейшага зьніжэньня якасьці, але павінны паставіць справу так, каб цалкам выканаць заданьне па зьніжэньні сабекошту і павышэньні прадукцыйнасьці працы пры абавязковым паляпшэньні якасьці прадукцыі».

Пераходзячы да бюджэтных пэрспэктыў, т. Рыкаў спыняецца на тых асобных мерапрыемствах па павялічэньні прыбыткаў, зьверх звычайнага прыросту іх, якія трэба было правесьці для забясьпячэньня пляну гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва бягучага году. Усяго-ж дадатковыя павялічэньні бюджэтных ресурсаў складаюць, прыкладна, паўтара мільярды руб. Выкананьне гэтай часткі бюджэту патрабуе найбольшых намаганьняў, асабліва з боку мясцовых органаў, якія павінны забясьпечыць свалчасовае паступленьне сродкаў за кошт прыбыткаў мясцовай прамысловасьці і кааперацыі. «Гэта цяжкая работа,—гаворыць т. Рыкаў,—але трэба выбіраць: **або кантрольныя лічбы і той рост шпаркі гаспадаркі, якія я вам паказаў і тады некаторае дадатковае напружаньне, або больш «спакойная» работа, але тады мы ня будзем мець такога шпаркага тэмпу сацыялістычнага разьвіцьця. Мы абралі першы шлях».**

Пераходзячы да якасных зьмен у эканоміцы пры ажыцьцяўленьні гаспадарчага пляну на падставе кантрольных лічбаў на 1929-30 г., тав. Рыкаў адзначае, што валавая прадукцыя цэнзавай прамысловасьці ў кантрольных лічбах будзе роўна 22,5 мільярдаў руб., супроць 14 мільярдаў у 1927-28 годзе. **Рост на 60 проц.**

Прадукцыя сельскае гаспадаркі будзе дасягаць 15 з лішнім мільярдаў руб., супроць 14,6 мільярдаў руб. у 1927-28 годзе. Такім чынам, удзельная вага найбольш арганізаванага сацыялістычнага сэктару прамысловасьці вялічэзна ўзрастае. Па-другое, у галіне сельскае гаспадаркі зьнівуся і расьце з вялізнай шпаркасьцю сэктар аграмаляваны, які заваёўвае ўсё больш рашаючую ролю ў разьвіцьці ўсяе сельскае гаспадаркі. Калі ў 1925-26 годзе дзяржаўныя і кааперацыйныя гаспадаркі вырабілі толькі 35 проц. усяго таго, што было зроблена ў нашым краі, то ў 1929-30 годзе яны зробяць ужо 51 проц., інакш гаворачы, большая частка ўсяе вытворчасьці Саюзу ССР па ўсіх сэктарах будзе створана ўжо ў аграмаджаным сэктары.

Адначаныя зьмены, зразумела, ня могуць ня выклікаць вялізнага перасоўваньня ў расстаноўцы клясавых сіл. Калі прасачыць эвалюцыю нашага гаспадарчага жыцьця ад часу руху нэпу, дык можна адзначыць наступныя **яны стадыі ва ўзаемаадносінах паміж сацыялістычнай прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай.** У пачатку нэпу эканамічная сувязь гораду з вёскай, прамысловасьці з сельскай гаспадаркай вызначалася ў бок гандлю, які параўнальна слаба рэгуляваўся. У гэтым гандлі з боку сельскае гаспадаркі выступаў разрозьнены вытворца, селянін, сялянскі двор. Другая стадыя характарызуецца значным кааперацыйным ахопам таваразвароту і разьвіцьцём прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў сялян (пераважна па лініі спэцыяльных галін сельска - гаспадарчай вытворчасьці). Трэцяя стадыя, у якую мы ўступілі ў сучасны момант, **гэта пэрыяд калгасаў, трактарных станцый, трактарных калён, саўгасаў, кантрактацыі, пэрыяд карэннай палітычнай рэконструкцыі ўсяе сельскае гаспадаркі.**

«Неабходнасьць арганізацыі саюзнага Наркамзему, — гаворыць у далейшым т. Рыкаў, — вынікае з таго, што цяпер упяршыню ў адносінах да земляробства **мы можам ужываць і ўжываем такія-ж мэтады плянаваньня, якія раней былі магчымы толькі ў адносінах да прамысловасьці».**

Тав. Рыкаў зазначыў далей, што мы ўсюды маем масавае імкненьне сялянства да пераходу ад дасталай дробнай, мала прадукцыйнай індывідуальнай гаспадаркі да буйное калектыўнае гаспадаркі, якая грунтуецца на ўжываньні навейшых с.-г. машын.

Калгасны рух у сучасны момант пэрайшоў на такія тэмпы разьвіцьця, якія перавышаюць нашы магчымасьці забясьпячэньня яго машынамі. У сувязі з тым, што рост машынабудаўніцтва адстае ад размаху калгаснага руху, трэба зрабіць той вывад, што неабходна ўсімі сіламі налегчы на будаўніцтва трактарных заводаў, заводаў камбайнаў і інш. Пакуль з магутных пабудаваных заводаў пачнуць выпускацца ў вялікай колькасьці патрэбныя нам трактары і камбайны, прыдзецца трактара-забесьпячэньне ў многім базавацца імпарце трактараў. Павялічэньне-ж імпарту высоўвае перад кожным калгасьнікам пытаньне аб патрэбнасьці ўсямернай дапамогі дзяржаве ў справе папярэньня экспарту. Кожнаму калгасьніку павінна быць ясна, што калі ён хоча хутчэй атрымаць для свайго калгасу трактар або камбайн, ён павінен дапамагчы стварыць патрэбны экспартны фонд.

Вынікі хлебазагатовак гэтага году гавораць, па-першае аб тым, што мы поўнасьцю выканаем плян хлебазагатовак у вельмі кароткі тэрмін, і, па-другое, аб тым, што за апошнія гады ўпяршыню мы будзем мець значны хлеб-рэзэрв. Шпарка ўзрастаючую ролю ў забесьпячэньні хлебам пачалі адыгрываць калгасы і саўгасы. Ужо ў гэтым годзе мы атрымаем ад калгасаў 100 млн. пуд. хлеба, ад саўгасаў—30 млн.; у будучым годзе ад калгасаў атрымаем ужо ня менш 300 млн. пуд. хлеба і ад саўгасаў—звыш 100 млн. пудоў. Гэта гаворыць аб тым, што мы сапраўды сталі выходзіць з затрудненьняў у вытворчасьці і забесьпячэньні хлебам.

Але значныя затрудненьні паўстаюць перад намі ў сувязі з жывёлагадоўляй. З вырашэньнем праблемы жывёлагадоўлі мы ня можам марнаваць часу. Бюджэтная камісія ЦВК паступіла зусім правільна, запрапанаваўшы правесьці дадатковыя асьцнаваньні на жывёлагадоўлю.

Абвастрэньне клясавае барацьбы адбываецца і ў горадзе. Павялічэньне, напрыклад, за апошнія гады шкодніцтва з боку некаторых груп спэцыялістых, некаторыя выступленьні на глебе рэлігійных вераваньняў і г. д.—усё гэта ідзе па адной лініі—па лініі абвастрэньня клясавае барацьбы, та ўсім гэтым выяўляецца аб'яднаньне намаганьняў усіх працоўнікаў пабудовы сацыялізму, праяўляецца правая небясьпека, буржуазная небясьпека ў нашай краіне. Таму той плян, тыя задачы, якія мы высоўваем, ня могуць быць ажыцьцёўлены без барацьбы з гэтай правай небясьпекай. З гэтага пункту погляду бюракратызм нашага апарату, бюракратычныя скрыўленьні і памылкі паасобных органаў прадстаўляюць сабою адзін з бакоў пытаньня аб правай небясьпецы. Нябачанае разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва, арганізацыя ўдарных брыгад на прадпрыемствах, рабочых брыгад, якія накіроўваюцца ў вёску на хлебазагатоўкі, для барацьбы за калгасы і г. д., бесьперапынны тыдзень, устанаўленьне 7-гадзіннага рабочага дня, бурны рост калгаснага будаўніцтва, зьяўленьне дзесяткаў тысяч трактараў у вёсцы, машынатрактарных станцый і г. д.,—усё гэта,—гаворыць тав. Рыкаў,—характарызуе пачатак тае эпохі, калі дзесяткі мільёнаў людзей арганізавана і згуртавана прыступаюць да сацыялістычнай работы. **Галоўнай парукай таго, што пяцігадовы плян будзе ажыцьцёўлен у больш кароткі тэрмін, чым гэта вызначалася, што кантрольныя лічбы на будучы год будуць выкананы, а быць можа і перавышаны,—гаворыць у заключэньне т. Рыкаў,—зьяўляецца мабілізацыя мас, рост іх актыўнасьці, згуртаванасьці. Усё гэта мы маем у такім разьмеры, які нам забясьпечвае перамогу.**

З такой масай, з такой рабочай клясаю, з тою актыўнасьцю бядняцка-серадняцкай масы сялянства ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, пры такой арганізаванасьці мы дагоним і перагонім у кароткі тэрмін увесь капіталістычны сьвет. (Доўгія бурныя воплескі).

Клясавая барацьба міжнароднага пралетарыяту

ПРАСЬЛЕДВАНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ НА ГАВАЙСКІХ ВЫСПАХ

НЬЮ-ЁРК, 1. З Гаваны, сталіцы Кубы, паведамляюць аб новай хвалі прасьледваньняў рэвалюцыйнага руху, у прыватнасьці, рабочых нэграў. Наймітыі рэакцыі забілі камуніста нэгра Брукса. Гаванскія ўлады награжаюць высылкай 23 рабочым, у тым ліку і некалькім кітайскім рабочым, якіх у Кітаі чакае пакараньне сьмерцю.

Хачу мірыцца!...

АНТЫФАШЫСЦКІ ФРОНТ У АУСТРЫІ ПАШЫРАЕЦЦА

Рабочыя даюць магутны адпор хэймвэру

ВЕНА, 2. Учарашні дзень у Аўстрыі адзначыўся фактамі пашырэньня антыфашысцкага пралетарскага фронту. У Вінэр-Нэйштадце, у сувязі з вярбовачным паходам хэймвэру (фашысцкая ваенная арганізацыя) некалькі груп сацыялістычнай моладзі, наперакор распараджэньню сацыял-дэмакратычнай партыі ігнараваць гэты паход, сабраліся на галоўным пляцы і напалі на праходзіўшых хэймвэраў. Хэймвэры самі правакавалі рабочых на напад зьняважальнымі выкрыкамі. Нападаўшая моладзь прарвала паліцэйскі кардон. Двое фашыстых ранены. Арыштавана 15 рабочых. Пры адыходзе хэймвэраў адарыліся новыя сутычкі. Рабочыя акружылі ўваход у паліцэйскі вучастак і прабавалі вызваліць арыштаваных таварышоў.

У Грасе ў часе дэманстрацыі рэспубліканскага шуцбунду таксама адбылася сутычка рабочых з хэймвэрамі. Некалькі фашыстых зьбіты. У Венскім пралетарскім квартале Фаварытэн вярбовачны фашысцкі паход быў спатканы бурнымі дэманстрацыямі пратэсту рабочых. Некалькі фашыстых зьбіты. Хэймвэрам прышлося адступіць. У прамысловым мястэчку Донавіц хэймвэры напалі на рабочых, якія пратэставалі супроць правакацыйнага хэймвэрскага паходу. Адказваючы на напады, рабочыя зьбілі значны лік хэймвэраў.

Барацьба за „Юманітэ" працягваецца

ПАРЫЖ, 1. Зборы на карысьць «Юманітэ» дасягнулі 1.152.000 франкаў. У апошнія дні наглядаюцца больш частыя ўносы ад мясцовых арганізацый брацкіх партый, у прыватнасьці ад арганізацый кампартыі Нямеччыны. Кам'ячэйкі прадпрыемства Лоўна, Вэркэ і раду Рурскіх прадпрыемстваў, авія-заводаў Юнкэрса і іншых дасылаюць сабраныя рабочымі сумы з прывітаньнямі францускім рабочым у іх барацьбе з рэакцыяй.

На міруцкім працэсе

ЛЁНДАН, 2. На сёняшнім пасяджэньні суда ў Міруце, які разглядае справу Індыйскіх рэвалюцыянэраў, пачаліся выступленьні прадстаўнікоў абвінавачаньня. Першы прадстаўнік абвінавачаньня ў сваёй прамове заявіў, што справа не накіравана супроць чыёнаў прафсаюзаў або нацыяналістых. Шасьцёра з падсудных сьцьвярджаюць, што яны падыходзяць іменна пад гэтыя катэгорыі. Калі будзе даведзена, што іменна ў гэтым іх абвінавачваюць, то яны будуць вызвалены з-пад адказнасьці.

Далей прадстаўнік абвінавачаньня заявіў, што Камінтэрн ставіць сваёю задачай ажыцьцяўленьне сусьветнай рэвалюцыі. «Мы,—заявіў прадстаўнік абвінавачаньня,—нападаем на Камінтэрн адкрыта і ад глыбіні душы».

НА ВАРЦЕ МЕЖАЎ СССР

ЯК ЗМАГАЕЦЦА ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ З КІТАЙСКІМІ БЕЛАБАНДЫТАМІ

Новыя перамогі Далёка-Ўсходняй арміі зьвярнулі на яе асаблівую ўвагу ўсіх працоўных нашага Саюзу. Гэраічныя ўчынкі Асобай Далёка-Ўсходняй арміі запальваюць кожнага з нас нарывам і палкай любоўю да адважных абаронцаў межаў СССР. Байцы Далёка-Ўсходняй арміі сваёй клясавай сьвядомасьцю, заслужылі на гэту вялізарную ўвагу. Мы ніжэй друкуем некалькі малюнкаў самаахвярнай барацьбы Чырвонай арміі.

Праглядаючы газэты Далёка-Ўсходняй арміі «Тревогу» і «Отпор», спатыкаеш апісаньні дзесяткаў фактаў сапраўднага гэраізму чырвоных камандзіраў і байцоў, якія абараняюць граніцы СССР ад кітайскіх белабандытаў.

Мы ведаем спаборніцтва фабрык і заводаў, спаборніцтва вёсак. Мы ведаем спаборніцтва Чырвонай арміі ў казарме і на палёх манэўравай вучобы. А вось вам сапраўднае баявое сацыялістычнае спаборніцтва чырвонаармейцаў на фронце, у баі—упартая барацьба за зьніжэньне сабекошту перамогі, за тое, каб з большым посьпехам, але з меншай стратаю пралетарскай крыві адстаяць недатыкальнасьць сацыялістычнага будаўніцтва.

— Савецкі параход «Чычэрын» праразае хвалі Амура. На параходзе—дэсант, наш адказ зарваўшымся кітайскім налётчыкам.

Некалькі гадзін аддзяляюць чырвоных байцоў ад надыходзячага дзяжкага бою. І ў гэтыя гадзіны чырвонаармейцы, сабраўшыся ў каюце, рыхтуюцца да наступленьня.

У каюту заходзіць чырвонаармеец Рудзенка. У яго руках кавалак паперы, а напісаныя карандашом літары паведамляюць камандзіра аб выкліку кулямётчыкаў яго ўзводу на сацыялістычнае спаборніцтва.

Праз гадзіну заключаны паміж кулямётчыкамі дагавор. У ім гаворыцца:

1. Работа кулямётаў павінна быць «безотказна». Ніводнай затрымкі па віне кулямётчыкаў.

2. Самая цьвёрдая дысцыпліна агню.

3. Ніводнае страты, ніводнае паломкі.

5. Ні аднаго камандзіра і чырвонаармейца, які не напісаў-бы пасьля бою заметкі ў «Тревогу».

Камісія: Барысаў, Гэршнец, Кібальчанка, Рудзенка.

А досьвіткам у баі на кітайскім беразе дагавор усім узводам быў выкананы «на 100 процантаў».

***

Рота ў брод пераходзіць рэчку. Разрыўною куляю ранены ў нагу малодшы камандзір тав. Прус. Ён сьціскае ад болю зубы і зварачаецца да свайго намесьніка:

— Прымеце ад мяне камандаваньне аддзяленьнем, вазьмеце маю вінтоўку. Мяне пакіньце на беразе, а самі пасоўвайцеся наперад.

Тав. Прус адмовіўся ад таго, каб яго аднесьлі на перавязачны пункт.

— З гэтым пасьпеецца... А зараз няма патрэбы людзей выводзіць з бою.

Партыйцы і камсамольцы—першыя ў баі. З іх радоў выходзяць чырвонасьцяжнікі—жывыя насьбіты слаўных традыцый гэраічных дзён грамадзянскай вайны.

— У раёне Даўры нашы часьці перайшлі ў контр-наступленьне. 4 рота № палка кінулася ў атаку. Першым скочыў у непрыяцельскі акоп камандзір роты, другім—палітрук. Палітрука спаткала куля кітайскага равальвэру, яшчэ сэкунда—і выстрал амаль ва ўпор...

Чырвонармеец—адказны арганізатар камсамолу тав. Грыгор'еў кінуўся на выручку, забіў кітайскага афіцэра і выратаваў палітрука. Тав. Грыгор'еў прадстаўлены да ордэну Чырвонага Сьцягу.

— Камсамолец Тамсон, цяжка паранены, застаўся пасьля бою на кітайскай тэрыторыі. Ён 5 сутак скітаўся ў тыле белых, унікаючы палону. Харчаваўся арэхамі і вадою. На шостыя суткі прабраўся, урэшце, у сваю часьць і прынёс з сабою шашку і гранаты.

— Карэец Кім Ю-чэн—камандзір узводу, партыец. Ён адзін кідаецца ў дзьверы няпрыяцельскага бліндажу і трапным забойчым агнём абстрэльвае заселых у бліндажы рускіх белагвардзейцаў. Тыя адказваюць шалёным агнём. Тав. Кім падкідвае ў бліндаж некалькі кулямётаў і ставіла замаўчаць белакітайскую артылерыю. Нашы часьці дэсанту пасьпяхова насоўваюцца наперад, кітайскае войска ў паніцы адступае.

— Ёсьць! Белакітайцы адступаюць!..

***

У баявой абстаноўцы, вядучы суровую барацьбу, байцы АДУА не адрываюцца ад агульнага жыцьця і работы працоўных нашага Саюзу. Спаборніцтва кулямётчыкаў і артылерыстых—гэта толькі адзін кавалачак, адна рыса іх непарыўнай сувязі з тым, чым жывуць і дыхаюць працоўныя СССР.

У баявой абстаноўцы ні на гадзіну, ні на мінуту ня спыняе працаваць партыйная арганізацыя часьці. Тут яшчэ больш пытаньняў і для яе, чым у мірнай абстаноўцы: трэба і арганізаваць палітыка-маральны стан байцоў, забясьпечыць посьпех баявой аперацыі і трэба ня спыняць ленінскага выхаваньня партыйных радоў, ня спыняць барацьбы за генэральную партыйную лінію. І на адпачынку, пасьля гарачай баявой схваткі партарганізацыя №-скага палка на працягу некалькіх гадзін горача бурліць, асуджаючы выступленьне правых ухілістых.

А вось—малюнак партсходу ў баявой абстаноўцы, у каюце дэсантнага параходу «Чычэрын», які ідзе ў бой з працоўнікам.

На парадку дня—два пытаньні: першы—прыём у партыю, другі—разгляд напярэдняй аперацыі.

Сёньня ў партыю прымаюць т. Амяльчанку—аддзялённага камандзіра, члена УсеЛКСМ з 1927 году.

— Прашу прыняць мяне ў партыю. **У баі я хачу біцца камуністым,**—заяўляе на сходзе Амяльчанка.

Выступаюць беспартыйныя чырвонаармейцы. Расказваюць, што ў мінулых сутычках з белакітайцамі т. Амельчанка ня раз даводзіў сваю адданасьць рабодзе добрым камуністым. Сход аднагалосна пастанавіў прыняць Амельчанку ў партыю.

***

Калі яшчэ грымелі гарматы і знарады працоўніка тналі баросны па вадзе Сунгары, на параход прывезьлі двух параненых байцоў. Адзін з іх быў т. Амельчанка—аддзялённы камандзір, «новахры шчаны» камунар. Куля бандыта ўпілася яму ў шыю і выйшла каля вуха. Але Амельчанка адчуваў сябе бадзёра і, сядаючы ў крэсла для перавязкі, расказваў:

— Мы залеглі і пачалі акопвацца. Як раз у гэты час мяне драпанула (!) у шыю. Доўга я ляжаў неперавязаным, таму што бандыцкія кулі стварылі заслону і нельга было займацца гэтым глупствам: я вёў агонь. Калі бандыты пад агнём нашай артылерыі замаўчалі, я перавязаў рану.

А калі перавязка была скончана, Амельчанка заявіў:

— Я добра сябе адчуваю, доктар. Дазвольце мне паехаць на бераг, бліжэй да бою.

***

Чырвоная армія—армія інтэрнацыянальная, Чырвонай арміі дорагі інтэрэсы ня толькі працоўных СССР, але і працоўных Кітаю. Чырвоная армія ня помсьціць кітайскім салдатам, але яна бязьлітасна зьнішчае кітайскіх генэралаў, афіцэраў і іх прыцеляў—рускіх белагвардзейцаў.

Аб працоўных Кітаю клапоцяцца чырвоныя байцы. Сухія радкі газэтнага нарысу апісваюць надзвычайна цікавыя факты і малюнкі бою.

Артылерыйскі агонь з таго боку па наш

Перад адкрыццём сэсіі польскага сойму

Гэтымі днямі адкрываецца пасяджэньне польскага сойму, адтэрміноване дэкрэтам прэзыдэнта распублікі на трыццаць дзён. Усе памятуюць абставіны гэтай адтэрміноўкі, выкліканай нечаканым зьяўленьнем у сьценах сойму групы ўзброеных афіцэраў, якія трымалі сябе надзвычай абураюча і адкрыта выказвалі гатоўнасьць расправіцца са ўсякім, хто пасьмее выказаць нездаваленьне чаканым выступленьнем «улюбёнага правадыра»—Пілсудзкага. Напалоханы такой дэманстрацыяй узброенай сілы старшыня сойму пэпэсавец Дашынскі, адмовіўся адкрыць пасяджэньне і прэзыдэнт распублікі адклаў пасяжэньне сойму.

Трудна сказаць, каб 30 дзён, якія ўжо канчаюцца, унесьлі што-небудзь новае ў суадносіны сіл, каторыя акрэсьліваюць ход палітычнага жыцьця Польшчы. Паранейшаму фактычная ўлада знаходзіцца ў руках ваенна-фашысцкае клікі, на чале якое стаіць Пілсудзкі. Як і месяц таму назад, краем кіруе «палкоўніцкае міністэрства». І таксама, як месяц таму назад, у польскім сойме, калі ня лічыць малалічныя групкі камуністых і дэпутатаў розных рабочых і сялянскіх груповак, якія да іх далучаюцца, няма ніводнай партыі, якая-б магла або хацела змагацца з наступаючым фашызмам і з яго правадыром Пілсудзкім.

Аб тым, якая пазыцыя самае буйное «апазыцыйнае» фракцыі сойму—ППС, можна меркаваць хаця-б па вядомай гісторыі візыту Дашынскага да Пілсудзкага ў канцы лета бягучага году. «Мацёры» пэпэсаўскі правадыр зьявіўся да дыктатара з прапановаю паслуг свае фракцыі, якой, як выказаўся Дашынскі, «абрылла бясплённая апазыцыя». Пэпэсаўцы згаджаліся супрацоўнічаць з урадам і ўвайсьці ў склад урадавага блёку. Але пры адным толькі ўмове—каб дыктатар звольніў у адстаўку занадта адкрыты фашысцкі ўрад Сьвітальскага.

Зусім відавочна, што калі-б пэпэсаўцы заявілі аб сваім пераходзе ва ўрадовы лягер, не прыпадняўшы рабочай клясе хаця-б такой «уступкі», як звальненьне ў адстаўку міністэрства палкоўнікаў, дык ім ня было-б чым праўдаць свае адкрытае рэнэгацтва. Як-ніяк пэпэсаўцам прыходзіцца лічыцца з настроямі ўсё больш лявеючага польскага пралетарыяту, і разьлічваць на ашуканьне рабочых мас яны маглі толькі пры спасыланьні на «добрадзейныя» вынікі кам прамісу і на дасягнутую быццам такім шляхам «дэмакратызацыю» ўрадавага рэжыму.

З улясьціваю яму фэльдфэбэльскаю грубасьцю, Пілсудзкі ня толькі адмовіўся ад згоды з пэпэсаўцамі, але і апублікаваў зьмест сваіх перагавораў з Дашынскім у друку. Трудна сказаць з упэўненасьцю, чым кіраваўся польскі дыктатар, імкнучыся канчаткова скампраметаваць пэпэсаўцаў у вачох рабочых мас. Пэўней за ўсё, ён адчувае сябе досыць моцным для таго, каб зрабіць патрэбны яму пераварот, не зварачаючыся па дапамогу да сацыял-фашыстых. Ён ведае, акрамя таго, што як-бы крута ён не паступіў з «дэмакратыяй» усёроўна польская «сацыялістычная» партыя не адважыцца і не захоча супраціўляцца яму. Ён правільна ацэньвае сёю глыбіню фашысцкага перараджэньня польскай «сацыялістычнай» партыі і ведае, што пэпэсаўцы ня менш, чым пілсудчыкі, ненавідзяць і баяцца рэвалюцыйных рабочых.

Польскі пралетарыят лявее з нязвычайнай шпаркасьцю. Хранічны гаспадарчы крызіс, які зараз перажывае Польшча, вялізарнае і безнадзейнае беспрацоўе, поўная адсутнасьць законаў, якія-б хаця ў нязначнай ступені абаранялі інтарэсы працы, адкрытае супрацоўніцтва ўраду з прадпрыемцамі і лёкайская роля ў адносінах за фашысцкага ўраду і капіталістых польскіх сацыял-фашыстых—усё гэта разьвеяла апошнія парляманцкія і дэмакратычныя ілюзіі польскіх працоўных мас. Улюбёнай партыяй польскага пралетарыяту становіцца камуністычная партыя, уплыў якой у вялікіх разьмерах расьце з кожным днём, ня гледзячы на нелегальныя ўмовы яе працы і на суровыя прасьледваньні ўсіх западозраных у прыналежнасьці да яе.

Польскае сялянства, не гаворачы ўжо аб сялянстве нацыянальных меншасьцяй, знаходзіцца ў стане бязупынага браджэньня. Абяцаньні аграрнае рэформы засталіся на паперы, эксплёатацыя працоўных мас памешчыкамі ўзмацняецца тым больш, што ў распараджэньні земляўласьнікаў заўсёды знаходзяцца паліцэйскія і вайсковыя сілы. Сфабрыкаваныя агентамі дэфэнзывы судовыя працэсы кінулі ў турмы сотні папулярных сярод сялян дзеячоў нацыянальнага вызваленьня Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Забастоўкі сельгаспрацоўнікаў сталі ў Польшчы звычайным зьявішчам, а ў апошні час на ўкраінах сталі больш частымі выпадкі падпалу памешчыцкіх двароў.

Пры гэтых умовах, асабліва з прычыны награжальнага для польскай буржуазіі і для польскіх сацыял-здраднікаў факту вялізарнага росту ўплыву кампартыі на працоўныя масы, Пілсудзкі добра ведае, што паміж ім і «апазыцыяй» у сойме няма ніякіх прынцыповых разгалосьсяў. І сапраўды, да гэтага часу «апазыцыйныя» партыі не адважыліся адмовіць яму ні ў адным злотым на паліцэйскія, а тым больш на ваенныя патрэбы. Колькі-б пэпэсаўцы ня крычалі аб пазабюджэтных выдатках, яны хоць і заднім чыслом заўсёды зацьвердзяць асигнаваньні на падрыхтоўку вайны супроць СССР. Пілсудзкі можа таму спакойна ігнараваць нібы апазыцыйныя выхадкі Дашынскага. Калі нават польскаму дыктатару і ўздумаецца разагнаць сойм, дык «апазыцыя», у тым ліку і ППС, будзе далей супрацоўнічаць з ім, гаворачы «рэвалюцыйныя» прамовы толькі для таго, каб не адштурхнуць ад сябе апошнія пласты рабочых, якія яшчэ ёй давяраюць. Але наўрад ці Пілсудзкі зараз расправіцца з «парлямантам». Патрэбнае яму абмежаваньне правоў сойму, ён правядзе і «легальным» шляхам, бо ў рашучую мінуту пэпэсаўцы яго падтрымаюць, каб «выратаваць дэмакратыю». Гэта звычайны шлях сацыял-фашыстых.

Палявеньне польскіх працоўных мас і нянавісьць да фашысцкага ўціску, якія так яскрава выявіліся ў выступленьні працоўных Львова супроць украінскіх фашыстых, гэтых наймітаў польскага імэрыялізму, награжаюць цяперашняй ваенна-фашысцкай Польшчы неаблічальнымі вынікамі. З прычыны небясьпекі, якая награжае абодвум крыльям польскага фашызму—буржуазнаму і сацыял-здраднікаму—не магчыма меркаваць, што яны могуць сур'ёзна сутыкнуцца паміж сабою. Наадварот, трэба цьвёрда сказаць, што яны нападуць адзін другому руку для супольнай барацьбы супроць «агульнага ворага»—рэвалюцыйнага пралетарыяту Польшчы, нацыянальных меншасьцяй і рэвалюцыйнага Савецкага Саюзу.

С. ЯВОРСКІ.

Лямпку Ільліча—у беларускія мястэчкі

У гэтым годзе будзе пабудавана каля 10 электрастанцый

Зараз ужо можна падвесьці некаторыя вынікі электрабудаўніцтва ў сельскіх мясцовасьцях па БССР за 1928-29 год. Паводле пяцігадовага пляну ў мінулым годзе меркавалася пабудаваць 8 самастойных электрастанцый, пераабсталяваць гідраэлектрастанцыю ў м. Глуск, Бабруйскае акругі, скончыць электрыфікацыю Віцебскага раёну, забясьпечыўшы яго электраэнэргіяй з Асінбуду, электрыфікаваць саўгас Уваравічы.

Як-жа выкананы першы год электрабудаўніцтва на вёсцы паводле пяцігодкі?

Зараз пабудавана ўжо і пушчана ў ход па БССР 7 электрастанцый, пераабсталявана адна станцыя магутнасьцю ў 308 квт.

Па Менскай акрузе пабудаваны і пушчаны ў эксплёатацыю электрастанцыі ў наступных мястэчках: Заслаўі, Капылі і Плешчаніцах, па Магілеўскай акрузе гідра-электрастанцыя у м. Бялынічах магутнасьцю ў 40 квт. Пабудавана газа-генэратарная электрастанцыя ў Бешанковічах, Віцебскае акругі, электрастанцыя ў м. Чарэя, Аршанскае акругі, у Парычах, Бабруйскае акругі. Некаторыя з гэтых станцый будуць працаваць на торфе. Акрамя таго пераабсталявана гідра-электрастанцыя ў м. Глуску, Бабруйскае акругі.

У 1928-29 апэрацыйным годзе пачата пабудова электрастанцый у наступных мястэчках: Халопенічы (Меншчына) магутнасьцю ў 60 квт. з тарфяным апалам, у Чырвонай Слабадзе (Бабруйшчына), у Тураве (Мазыршчына) магутнасьцю ў 60 квт. і ў саўгасе Адаменка (Віцебшчына) магутнасьцю ў 100 квт. Амаль усе гэтыя станцыі будуць карыстацца тарфяным апалам.

Ужо праведзена падрыхтоўчая работа па ўстаноўцы слупоў і падвесцы дроту для трас па электрыфікацыі Віцебскага раёну з Асінбуду. Усяго ў гэтым раёне мяркуецца электрыфікаваць звыш 1500 насельніцкіх пунктаў плошчаю ў 2000 кв. кілёмэтраў. У 1929-30 г. будуць пабудаваны электрастанцыі ў наступных мястэчках: у Талачыне (Аршанскае акругі) магутнасьцю ў 250 квт., у Дрысе (Полацкае акругі)—у 240-250 квт., у Караліне (Мазырскае акругі) магутнасьцю ў 300-400 квт. Акрамя таго будуць пабудаваны электрастанцыі ў саўгасах Ціхінічы Уваравічы (Гомельскае акругі) магутнасьцю ў 100 квт.

Л. Х.

КОЖНЫ РАЁН АТРЫМАЕ АЎТАМАШЫНУ

30 аўтамабіляў калгасам

У Менск пачалі прыбываць аўтамабілі для БССР. Ужо прывезена 25 машын. У Адэсу прыбылі 20 аўстрыйскіх аўтабусаў, якія будуць адгружаны ў Менск у гэтым месяцы. Гэтымі днямі ў Менск прыбываюць 20 паўгрузавых машын сыстэмы «Форд», якія зараз знаходзяцца ўжо ў Ленінградзе. Усяго на працягу бліжэйшага часу Беларусь атрымае 65 машын.

Частка атрыманых аўтамабіляў разьмеркавана сярод менскіх дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый. Машыны, якія прыбудуць гэтымі днямі, будуць разьмеркаваны наступным чынам: Віцебшчыне—4, Бабруйшчыне—5, Аршаншчыне—4, Мазыршчыне—3, Полаччыне—1, Гомельшчыне—8, Магілеўшчыне—5

У Менску, у сувязі з атрыманьнем новых машын, арганізуецца грузавая калёна. Да вясны мяркуецца атрымаць 30 аўтамабіляў спэцыяльна для будаўнічых работ і 30 машын для калгасаў.

Не пазьней лістапада кожны раён БССР атрымае аўтамабіль, які будзе знаходзіцца ў распараджэньні райвы-

Партыйнае будаўніцтва

Генэральная праверка бальшавіцкіх радоў

Шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, сваячасова выпраўляючы памылкі і хібы ў практыцы праверкомаў, узьнімем праверку і чыстку партыі на яшчэ большую прынцыповую, палітычную вышыню

Скарыстаць чыстку партыі для ўзмацненьня барацьбы з тэорыяй і практыкай правага апартунізму і прымірэнцтвам да яго, а таксама з „левымі" загібамі і рэцыдывамі трацкізму

Супроць паклёпніцкіх выступленьняў

Рашуча адмятаючы БЕСПАДСТАЎНЫЯ абвінавачаньні супроць праверкомаў з мэтай сарваць чыстку, разгорнем шырокую бальшавіцкую самакрытыку недахопаў праверкі і работы камісій

За апошні час у практыцы чысткі савецкіх і партыйных ячэек мелі месца факты паклёпніцкіх выступленьняў з боку асобных партыйцаў супроць камісій па чыстцы. Частка камуністых імкнулася дыскрэдытаваць некаторыя праверкомы, абвінаваціць іх у вульгарызацыі палітычных задач чысткі партыі, у ніверным і павярхоўным падыходзе да праверкі камуністых даных ячэек.

Паклёпніцкае выступленьне супроць праверкому мела месца на чыстцы ячэйкі Белжысгаспраму. Тут два члены партыі абвінавацілі праверком у няправільным правядзеньні чысткі, імкнуліся дыскрэдытаваць членаў камісіі перад ячэйкай. Наглая вылазка супроць праверкому была таксама і на сходзе па чыстцы ячэйкі Наркамзему БССР, дзе адзін камуністы беспадстаўна абвінавацілі старшыню праверкому т. Бягуна ў розных антыпартыйных учынках аж да крымінальнага злачынства.

Калі пытаньне было пастаўлена рубам, дык партыйцы, якія выступілі з абвінавачаньнямі супроць праверкомаў, нічым ня здолелі давесьці правільнасьць сваіх абвінавачаньняў, не падалі ні аднаго больш-менш канкрэтнага факту, які-б пацьвердзіў правільнасьць іх выступленьняў.

Прэзыдыум МенАКК і «Зьвязда» сваячасова завастрылі ўвагу партыйных арганізацый на фактах беспадстаўных, паклёпніцкіх выступленьняў супроць некаторых праверкомаў, мабілізаваўшы партыйцаў на барацьбу з апаганеньнем задач і палітычных прынцыпаў, паказаўшы на антыпартыйны характар і шкодласьць беспадстаўных выступленьняў супроць праверкомаў.

На жаль, факты беспадстаўных выступленьняў супроць праверкомаў ня спыняюцца. Гэтымі днямі мы сустрэліся з новым фактам дыскрэдытацыі праверкому, з актам імкненьня абвінаваціць камісію па чыстцы ячэек КП(б)Б Наркамфіну БССР, Менакрфа і банкаўскіх установ у фармальным падыходзе да чысткі, у правядзеньні няправільнай лініі пры праверцы даных ячэек. Пасьля сканчэньня чысткі ячэек Наркамфіну, акрфа і банкаўскіх установ пачалі распаўсюджвацца розныя недарэчныя чуткі аб памылках і няправільнай лініі, якую праводзіла камісія па чыстцы. Гэтыя чуткі неўзабаве дайшлі да ячэйкі КП(б)Б заводу «Дрэвааапрацоўшчык», дзе працуе камісія, якая правяра парт'ячэйкі Наркамфіну, акрфа і банкаўскіх установ.

У прыватнасьці, камісію абвінавачвалі ў аднабокім падыходзе да праверкі асобных партыйцаў. Канкрэтных заяў на няправільныя ўчынкі праверкому з боку асобных партыйцаў МенАКК не атрымала, але чуткі, якія распаўсюджваліся па Менску, награжалі поўнай дыскрэдытацыяй усяго складу камісіі перад партыйнымі масамі.

І таму ня дзіва, што асобныя камуністыя заводу «Дрэвааапрацоўшчык», даведаўшыся аб гэтых чутках, пачалі выказваць некаторае недавер'е да праверачнай камісіі, якая праводзіць чыстку ячэйкі прадпрыемства.

Прэзыдыум МенАКК склікаў аб'яднаны сход ячэек КП(б)Б Наркамфіну, Менакрфа і банкаўскіх установ, на якім паставіў пытаньне аб рабоце камісіі па чыстцы. На сходзе высьветлілася, што ў асноўным камісія праводзіла правільную лінію і ніякіх памылак у сваёй рабоце па праверцы і чыстцы ячэек Менакрфа, НКФіну БССР і банкаўскіх установ Менску не дапусьціла. Партыец Рэксьцін, які да сходу абвінавачваў камісію ў грубых адносінах да яго, на сходзе нічога канкрэтнага не сказаў, не пацьвердзіў сваю заяву ніякімі фактамі.

Калі камісія выключыла т. Рэксьціна з партыі, дык ён у прыватнай гутарцы заявіў, бышцам старшыня праверкому т. Бартквіч так растлумачыў яму (Рэксьціну) прычыны яго выключэньня:

— Мы цябе выключылі таму, што так было патрэбна.

Потым, калі камісія пераглядзела справу т. Рэксьціна і адмавіла яго ў радох партыі, апошні ня прызнаўся адкрыта ў беспадстаўнасьці сваіх абвінавачаньняў супроць старшыні праверкому т. Бартквіча і нічога канкрэтнага не сказаў. А між тым, заява Рэксьціна аб тым, што камісія так фармальна і груба растлумачыла яму прычыны яго выключэньня з радоў партыі, у значнай меры спрыяла распаўсюджаньню паклёпніцкіх чутак супроць праверкому.

Есьць яшчэ факты беспадстаўных абвінавачаньняў праверкому, якія грунтуюцца на глебе асабістых інтарэсаў, на глебе асабістага нездавальненьня тымі пакараньнямі, якія вынесла камісія па чыстцы таму ці іншаму партыйцу.

Аб'яднаны сход ячэек Наркамфіну БССР, банкаўскіх установ Менску і Менакрфа, заслухаўшы інфармацыю члена прэзыдыуму МенАКК КП(б)Б т. Жуковіча аб тым, што некаторыя т.т. лічаць, што камісія па чыстцы ячэек банкаўскіх установ, Менакрфа і Наркамфіну праводзіла няправільную лінію пры чыстцы, канстатуе, што:

— Чуткі аб няправільнай лініі камісіі зьяўляюцца беспадстаўнымі, неўгрунтаванымі, зьяўляюцца паклёпам на праверачную камісію. Агульны сход лічыць, што камісія чула і на таварыску падыходзіла да кожнага члена і кандыдата партыі, і работа камісіі, ня гледзячы на жорсткія меры пакараньня ў адносінах да асобных таварышоў, заслугоўвае поўнага ўхваленьня. Сход асудзіў паклёпніцкія выступленьні супроць камісіі з боку т. т. Гельфэра і Рэксьціна, кваліфікуючы іх учынкі, як небальшавіцкія і шкодныя, якія перашкаджаюць пасьпяховаму правядзеньню чысткі.

На гэтых фактах трэба яшчэ і яшчэ раз завастрыць увагу партыйных арганізацый, трэба жорстка і сваячасова рэагаваць на ўсялякія беспадстаўныя паклёпніцкія выступленьні супроць праверкому, на ўсялякія імкненьні беспадстаўна дыскрэдытаваць даны праверком.

Гэта ні ў якай меры ня значыць, што работу праверкому нельга крытыкаваць, што нельга выяўляць і выпраўляць памылкі і недахопы асобных праверкомаў. Наадварот, трэба разгрнуць яшчэ больш шырокую крытыку і самакрытыку навакол работы праверкомаў, каб, сваячасова выпраўляючы памылкі і хібы ў практыцы праверкомаў, узьняць чыстку партыі на яшчэ большую прынцыповую палітычную вышыню.

Але адначасова трэба даваць жорсткі адпор усялякім спробам беспадстаўна скампрамэтаваць даны праверком, дыскрэдытаваць яго перад партыйнымі масамі.

Юр. Т—к.

Пастанова бюро парткалектыву АБВШ

аб вылазцы трацкістага Быкава*)

Бюро парткалектыву АБВШ, абмеркаваўшы выступленьне Быкава на камсамольскім сходзе пульроты, адзначае, што:

— Быкаў адкрыта выступіў з прапагандай трацкісцкіх поглядаў па асноўных пытаньнях палітыкі партыі ў вёсцы і па індустрыялізацыі краіны. Быкаў высунуў супроць партыі паклёпніцкае абвінавачаньне аб «перараджэньні партыі», заявіў аб тым, што «ён падпарадкуе ўсё сумненьню» і г. д.

— Быкаў, знаходзячыся ў радох партыі, падтрымліваў сувязь з трацкістымі і вёў дэзарганізатарскую работу ў партыі.

Бюро адзначае, што Быкаў прабаваў прапагандаваць трацкісцкія погляды на камсамольскім сходзе, імкнучыся супроцьпаставіць камсамол партыі.

За прапаганду поглядаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму, за сувязь з трацкістымі, за антыпартыйную вылазку на камсамольскім сходзе з мэтай супроцьстаўленьня камсамолу партыі—Быкаў выключаны з радоў КП(б)Б.

Бюро калектыву АБВШ, з усёй рашучасьцю асудзіўшы погляды Быкава, заклікала ўсю партарганізацыю АБВШ яшчэ больш згуртавацца навакол генэральнай лініі партыі і ўзмацніць яшчэ больш барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, мацней ударяючы па «левых» загібах і настроях, па рэцыдывах трацкізму.

Бюро калектыву адзначыла, што прэзыдыум парт'ячэйкі, бюро калектыву і асобныя члены партарганізацыі АБВШ яўна недаацанілі трацкісцкую вылазку Быкава. Прэзыдыум парт'ячэйкі, асобныя партыйцы і бюро калектыву АБВШ не зрабілі палітычных вывадаў з гэтай справы, ня выхавалі партарганізацыю на даным канкрэтным выпадку, не мабілізавалі партыйнай думкі. Выходзячы з гэтага, бюро парткалектыву вынесла рад партспагнаньняў і арганізацыйных вывадаў. Прэзыдыуму парт'ячэйкі 1-й роты абвешчана вымова. Ухвалена пастанова аб правядзеньні датэрміновых перавыбараў прэзыдыуму ротнай ячэйкі.

*) Прынята аднагалосна.

У ячэйцы БАН

У апошнія тыдні адбыліся тры адкрытыя сходы ячэйкі КП(б)Б БАН. Сходы праходзілі пры шырока разгорнутай самакрытыцы, якая закранала ўсе бакі дзейнасьці Акадэміі. Рэдакцыя ў бліжэйшыя дні зьмясьціць на старонках «Зьвязды» матар'ялы аб рабоце гэтых сходаў [1]).

[1]) Артыкул т. Валабрынскага, прысьвечаны крытыцы работы Яўсэктару Акадэміі, не ўвайшоў у гэты нумар і будзе зьмешчаны ў бліжэйшым нумары.

Па вытворчых парткалектыва

Падрыхтоўку да чысткі ўвязаць з задачамі вярбоўкі

Адной з асноўных задач праверкі і чысткі вытворчых ячэек зьяўляецца вярбоўка рабочых у партыю.

Ячэйка КП(б)В друкарні БДВ разгарнула шырокую работу на практычным выкананьні гэтае задачы.

Быў заслуханы даклад аб чыстцы парткалектыву і вярбоўцы рабочых у партыю на агульным партыйным сходзе з удзелам беспартыйных рабочых. Таксама было пастаўлена пытаньне аб чыстцы і вярбоўцы на прафактыве, дэлегацкім сходзе работніц, на цэхавых сходах камсамольскай ячэйкі і г. д. Друкаваная газэта «Чырвонае Шыла» аддала гэтаму пытаньню вялікую ўвагу. Сярод беспартыйных рабочых была распаўсюджана папулярная літаратура па партыйна-палітычных пытаньнях. Вылучана камісія ў дапамогу праверкому для падрыхтоўкі канкрэтных матар'алаў.

Дзякуючы сыстэматычнай рабоце па вярбоўцы ў партыю, мы маем наступныя вынікі: з мая завербавана ў партыю 19 рабочых ад варштату, з іх 6 камсамольцаў і 8 работніц.

Парткалектыў узмацніце сваю работу па вярбоўцы перадавых рабочых у рады партыі. У выніку 15 лепшых рабочых падалі заявы аб прыёме іх у рады КП(б)Б. Сярод іх тав. Атлас, першы зрабіў выклік па сацыялістычным спаборніцтве ў наборным цэху, актыўна прымае ўдзел у вытворчых нарадах. Мае вялікі вытворчы стаж. Тав. Споўш зрабіў выклік па сацыялістычным спаборніцтве ў машынным цэху. Даўно працуе на вытворчасьці. Тав. Ляўкоў — кваліфікаваны рабочы, старшы на аддзяленьні. Таксама т. т. Левітан, Слабадзкая, Хоруц, Гельфанд, Бергер і інш. Усе з вялікім вытворчым стажам і прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве.

***

Шырока разгарнула падрыхтоўчую работу на чыстцы і вярбоўцы парт'ячэйка заводу «Камунар» (Менск).

Акрамя праведзеных сходаў па пытаньні чысткі і вярбоўкі, парт'ячэйка мяркуе арганізаваць вечар пытаньняў і адказаў, прысьвечаны чыстцы і задачам вярбоўкі. Працуе гурток па вывучэньні пастаноў 16 партканфэрэнцыі, у якім прымае ўдзел 75 рабочых. Вылучана камісія па праверцы працдысцыпліны партыйца. Вывешаны плякаты па цэхах, разданы лістоўкі рабочым па пытаньні чысткі парт'ячэйкі і вярбоўкі лепшых рабочых у рады партыі. Да недахопаў у рабоце парт'ячэйкі трэба аднесьці тое, што з мая месяца ўсяго прынята ў партыю 30 рабочых, між тым, на заводзе працуе 600 рабочых і работніц. Мала ў гэтым напрамку зрабіў камсамольскі калектыў. З 30-ці прынятых у партыю рабочых — усяго 7 камсамольцаў, у той час, калі пры лепшай рабоце як партыйнай, так і камсамольскай ячэек можна было-б дасягнуць лепшых вынікаў. Камсамольская ячэйка слаба займалася падрыхтоўкай лепшых перадавых камсамольцаў у партыю.

***

На Эльводе (Менск) умовы работы ня спрыяюць вярбоўцы рабочых у рады партыі. Калі на другіх фабрыках і заводах усе рабочыя сканцэнтраваны ў адным месцы, дык на Эльводзе справа зусім іншая. Большасьць рабочых раскідана па ўсім горадзе, таму на прадпрыемстве трудна весьці масавую работу сярод рабочых. Аднак, ня гледзячы на гэта, ячэйка Эльводу ў сваёй рабоце дасягнула значных посьпехаў. Калі за 1929 год завербавана толькі некалькі рабочых у партыю, дык з мая месяца г. г. прынята 11 рабочых. Мала перадана з камсамольскай ячэйкі ў партыю, усяго адзін камсамолец.

Падрыхтоўчая работа да чысткі ячэйкі і вярбоўка рабочых у партыю праводзіцца. У часе абедзенага перапынку сыстэматычна праводзіцца гутаркі з рабочымі наконт чысткі ячэйкі і вярбоўкі рабочых у партыю. Станоўчыя вынікі дае работа індывідуалаў. Насьцягаэта Эльводу не зьмяшчае канкрэтных матар'ялаў аб чыстцы і вярбоўцы ў партыю, а займаецца агульнымі разважаньнямі. Ячэйка павінна яшчэ больш узмацніць падрыхтоўчую работу да чысткі і зрабіць усё магчымае, каб забясьпечыць актыўны ўдзел беспартыйных рабочых у праверцы ячэйкі.

І. Р—н.

ПЛЯНЫ ВЯСНОВАЙ СЯЎБЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Мабілізуем усе сілы партыі, рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас для іх пасьпяховага выкананьня

Якія задачы надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі ў БССР? Якія мерапрыемствы прадугледжвае падрыхтоўка да яе ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі?

Папершае, трэба ажыцьцявіць далейшае пашырэньне пасеўплошчы, у прыват пасьці плошчы пад таварна - тэхнічныя культуры і культуры траў, якія маюць рэканструкцыйнае значэньне ў галіне паляводзтва і жывёлагадоўлі.

З другога боку, трэба дабівацца максымальнага павышэньня ўраджайнасьці.

Узмацненьне існуючых посьпехаў у калгасным будаўніцтве і далейшае разгортваньне тэмпу калектывізацыі і каапэраваньня бядняцка - серадняцкіх гаспадарак зьяўляецца, зразумела, аднэй з асноўных умоў посьпеху кампаніі.

Пашырэньне кантрактацыі пасеваў, паляпшэньне і пашырэньне кармавой базы, узмацненьне агравытворчай дапамогі бядняцка - серадняцкім пластом на базе каапэраваньня — усё гэта прадугледжваецца у больш шырокім разьмеры, чым у мінулыя гады.

Зразумела, што ажыцьцяўленьне гэтых вялізарных задач залежыць у значнай ступені ад добрай арганізацыі справы падрыхтоўкі да веснавой кампаніі. Вось чаму сёлета, асабліва цьвёрда будзе праведзена плянавасьць у падрыхтоўчай рабоце. Плян пасеўнай кампаніі даводзіцца да асобнай вёскі, асобнага калгасу, саўгасу, каапэрацыйнага аб'яднаньня.

Посьпеху кампаніі павінен дапамагчы той значны разьмер зямляўпарадкаваньня — 900.000 гэкт., якое сёлета праведзена ў БССР.

У сельска - гаспадарчыя ўжыткоўнасьці ўключаецца значная плошча малакаштоўнага лесу.

Пашыраецца меліярацыя — гэта дазваляе спадзявацца на значнае павялічэньне пасеўнай плошчы ў параўнаньні з мінулым годам. Тэмп калектывізацыі таксама зробіць свой уплыў на рост пасеўнай плошчы, бо будзе значна лягчэй узьдзейнаць на насельніцтва шляхам арганізацыйных агра-вытворчых мерапрыемстваў. У выніку ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых мер веснавая пасеўная плошча павінна павялічыцца на 5,8 проц.

Павялічэньне пасеваў тэхнічных культур складзе: па ільне і каноплях 11 проц., па бульбе — 6 проц., па кормаплодах — 481,9 проц., па ільне — 56,6 проц.

Удзельная вага саўгасаў у яравым кліне складзе 1,9 проц., калгасаў — 12,42 проц. і індывідуальнага сэктару —85,68 проц.

Саўгасы маюць заданьне павялічыць ураджайнасьць ня менш, чым на 30 проц., калгасы — на 25 проц. і індывідуальныя гаспадаркі — на 20 проц.

Арганізацыя калгасаў і каапэрацыйных вытворчых аб'яднаньняў зойме вялізарнае месца ў падрыхтоўчай кампаніі. Яравая пасеўная плошча калгасаў падвысіцца да 343.000 га замест 36 тысяч у мінулым годзе. На 1-га кастрычніка 1929 г. па БССР налічвалася 4.811 вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньняў; у бягучым-жа годзе гэта лічба павінна ўзрасьці да 8.315. Усе 100 проц. бядняцкіх гаспадарак павінны быць каапэраваны. Наколькі перад намі вялікая задача ў гэтых адносінах, сьведчыць тое, што з 228.800 бядняцкіх гаспадарак, якія ёсьць у БССР, да сучаснага моманту каапэравана толькі 179.000.

Значная ўвага будзе сёлета зьвернута на пашырэньне суцэльных пасеваў гатунковага аўсу. Гатунковы авёс павінен заняць 60 проц. плошчы ўсіх пасеваў пад гэту культуру. Каб выканаць гэты плян, мяркуецца завезьці звыш 133 тысяч цэнтнэраў гатункового аўсу па лініі саюзхлеба, 81.684 цэнтн. атрымаць ад кантрактантаў і 110 тысяч цэнт. загатовіць у нашай рэспубліцы. 45 тысяч цэнтнэраў аўсу павінна таксама даць чацьвертая рэпрадукцыя Дзяржсемкультуры.

Якія пэрспэктывы ёсьць на забесьпячэньне сельскай гаспадаркі пасеўным матар'ялам?

Сёлета прымаюцца ўсе меры, каб забясьпечыць пашырэньне пасеваў канюшыны, вікі і сэрадэлі, што павінна значна палепшыць нашу кармавую базу. Насеньня канюшыны будзе завезена і загатоўлена на 240 проц. больш, чым летась, цімафееўкі — на 102 проц., вікі — на 283 проц.

Вялізарная ўвага аддаецца сёлета ажыцьцяўленьню прасьцейшых агра-мерапрыемстваў. У парадку арганізацыі яравое насеньне ў індывідуальных гаспадарках павінна быць ачышчана на 90 проц., а ў калгасах і саўгасах — на ўсе 100 проц. У БССР будзе працаваць 5.283 машыны па ачыстцы насеньня, якія павінны ачысьціць 157.200 тон яравога збожжа і 23.850 тон насеньня тэхнічных культур. Нагрузка на адну машыну складзе 35 тон.

У сувязі з недастатковым завозам мінэральных угнаеньняў, вялізарнае значэньне набывае скарыстаньне мясцовых рэсурсаў і магчымасьцяй. Летась прадугледжвалася тарфаваць 5.000 гэкт. пасеваў, але гэтае заданьне было выканана толькі на 65 проц. Сёлета павінна быць затарфавана 40.000 гэктараў. У мінулым годзе ў БССР было сабрана 13.065 тон попелу. Практыка масавага збору попелу прадпрыемствамі і насельніцтвам паказала, што гэта справа можа быць сёлета значна пашырана. Мяркуецца да вясны сабраць 22.200 тон попелу, якія накіраваць выключна ў калгасы і саўгасы.

Пашыраецца сетка рамонтных майстэрань. Летась у БССР налічваліся 303 рамонтныя майстэрні, сёлета арганізуецца новых 119 рамонтна - сьлясарных майстэрань, 24 мэханічныя майстэрні.

Ужываецца рад мерапрыемстваў па паляпшэньні кармавой базы. Будуць праведзены ў парадку аграмінімуму культур-тэхнічныя работы на плошчы ў 300 тысяч гэкт. сенажаці (супроць 165 тысяч у мінулым годзе). Палявое травасеяньне і пасеў спэцыяльных культур на насеньне павялічваецца на 50 проц. Намячаецца пабудова 2.263 сілосных установак у калгасах і саўгасах.

Урэшце, трэба адзначыць, што пашыраецца і кантрактацыя. Сёлета будзе закантрактавана 200 тысяч гэктараў яравых культур. Кантрактацыя насеньня ахопіць плошчу ў 20 тысяч гэктараў.

Такі папярэдні плян веснавой пасеўнай кампаніі ў БССР. Пытаньне аб мінэральных угнаеньнях, вялізарнае значэньне набывае скарыстаньне мясцовых рэсурсаў і магчымасьцяй. Летась прадугледжвалася тарфаваць 5.000 гэкт. пасеваў, але гэтае заданьне было выканана толькі на 65 проц. Сёлета павінна быць затарфавана 40.000 гэктараў. У мінулым годзе ў БССР было сабрана 13.065 тон попелу. Практыка масавага збору попелу прадпрыемствамі і насельніцтвам паказала, што гэта справа можа быць сёлета значна пашырана Мяркуецца да вясны сабраць 22.200 тон попелу, якія накіраваць выключна ў калгасы і саўгасы.

Пашыраецца сетка рамонтных майстэрань. Летась у БССР налічваліся 303 рамонтныя майстэрні, сёлета арганізуецца новых 119 рамонтна - сьлясарных майстэрань, 24 мэханічныя майстэрні.

Ужываецца рад мерапрыемстваў па паляпшэньні кармавой базы. Будуць праведзены ў парадку аграмінімуму культур-тэхнічныя работы на плошчы ў 300 тысяч гэкт. сенажаці (супроць 165 тысяч у мінулым годзе). Палявое травасеяньне і пасеў спэцыяльных культур на насеньне павялічваецца на 50 проц. Намячаецца пабудова 2.263 сілосных установак у калгасах і саўгасах.

Урэшце, трэба адзначыць, што пашыраецца і кантрактацыя. Сёлета будзе закантрактавана 200 тысяч гэктараў яравых культур. Кантрактацыя насеньня ахопіць плошчу ў 20 тысяч гэктараў.

Такі папярэдні плян веснавой пасеўнай кампаніі ў БССР. Пытаньне аб мі-

Да рэалізацыі пастаноў апошняга пленуму ЦК УсеКП(б)

Сельсаветы, тварам да калгасаў

Пастановы лістападаўскага пленуму ЦК зьяўляюцца тэй праграмай, вакол якое трэба мабілізаваць пралетарскія масы, масы беднякоў і сераднякоў. Лістападаўскі пленум ЦК яшчэ больш разьвіў генэральную лінію нашай партыі, ухваленую 15 зьездам партыі, пасьлядоўна разгорнутую 16 партканфэрэнцыяй і чарговымі пленумамі ЦК. Генэральная лінія нашай партыі патрабавала перабудаваньня работы ўсіх арганізацый. Шпарчэй і лепш за ўсё гэту перабудову прарабіла партыя. Вялікія посьпехі па гэтай перабудове мы маем у прамысловасьці, асабліва ў сэктары, які здабывае сродкі вытворчасьці.

Некаторыя посьпехі ёсьць і ў галіне перабудаваньня работы прафсаюзаў, хоць яны нас зусім не задавольваюць. Таксама ёсьць посьпехі і ў справе перабудаваньня раду іншых арганізацый. Нагул становішча можна ахарактарызаваць так: партыя, савет

Па БССР

Што зроблена на сродкі самаабкладаньня

ВОРША. (Наш кар.) У акрузе на сродкі самаабкладаньня адрамантавана 169 школьных будынкаў, пастаўлена 86 новых, абсталяваны 3 зубныя габінэты, адрамантавана 11 лекавых пунктаў і больніц, пабудаваны 18 пажарных вышак, 64 пажарныя хлявы, набыта 56 пажарных машын і г. д. ё

Такім чынам, ня гледзячы на тое, што яшчэ ня ўсе сабраныя ад самаабкладаньня сродкі выкарыстаны поўнасьцю, усё-ж эфэктнасьць будаўніцтва на гэтыя сродкі досыць значная. Сяляне бачаць і пераконваюцца ў тым, што грошы, якія яны ўносяць па самаабкладаньні, не прападаюць дарма, а ідуць на паляпшэньне дабрабыту вёскі.

Акруговыя канфэрэнцыі груп беднаты

ВОРША. (Наш кар.). Адкрылася акруговая канфэрэнцыя беднаты Аршаншчыны. Канфэрэнцыю віталі сакратар АК КП(б)Б т. Віляністовіч, старшыня АВК, прадстаўнікі Чырвонай арміі, рабочых чыгуначнікаў і рабочых Хладбуду.

Учора дэлегаты канфэрэнцыі наведалі Асінбуд. Будаўніцтва электрастанцыі зрабіла на дэлегатаў вялізарнае ўражаньне. Усе дэлегаты заявілі: «Мы ніколі ня бачылі такой вялізарнай пабудовы. Зараз мы ведаем, што нашы грошы ідуць на карысьць сацыялізму».

Канфэрэнцыя заслухала даклад старшыні АВК аб пяцігадовым пляне. У спрэчках выказалася 25 дэлегатаў, якія патрабавалі суцэльнай калектывізацыі раёнаў і хутчэйшага правядзеньня пяцігадовага пляну.

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Сёньня закрылася другая акруговая канфэрэнцыя груп беднаты. У рабоце канфэрэнцыі прымала ўдзел больш за 100 ч. Па ўсіх дакладах беднота выступала вельмі актыўна. У спрэчках па дакладу аб калектывізацыі запісалася больш 40 чал. Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б, у якой заявіла аб сваёй гатоўнасьці дапамагчы партыі правесьці суцэльную калектывізацыю Віцебшчыны на працягу двух год.

Сьмерць члена ЦВК БССР праф. Алонава

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Учора пасьля нядоўгай хваробы памёр член ЦВК БССР праф. Беларускага дзяржаўнага вэтэрынарнага інстытуту т. Алонаў.

Алонаў зьяўляецца арганізатарам адзнаго з лепшых у СССР Віцебскага вэтэрынарна-заалёгічнага музэю. Нябожчык «ктыўна працаваў у ВАРНІТСО, ён быў ініцыятарам адкрыцьця нядзельнага рабочага ўнівэрсытэту. Праф. Алонаў выдзяляўся сярод навуковых працаўнікоў Віцебску сваёй адданасьцю справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Пабудова тэатру-клюбу

МАЗЫР. (Наш кар.). У Мазыры пачалася пабудова тэатру-клюбу. Умяшчальнасьць залі—700 чал. Акрамя гэтага тэатр будзе мець аўдыторыю на 200 чал. Кошт пабудовы тэатру-клюбу — звыш 400 тыс. руб.

У самым цэнтры гораду пабудавана новая амбуляторыя, якая каштавала 60 тыс. руб.

Каапэрацыйныя склады песаматар'ялаў

ВОРША. (Наш кар.). Каб забясьпечыць насельніцтва акругі ялам і будаўнічымі матар'яламі, Днепрасаюз арганізаваў у 10 больш буйных пунктах акругі склады дроў і лесаматар'ялаў. Склады забясьпечваюцца Лесбелам і лесараспрацоўкамі МБВ чыг.

Кулацтва шукае ратунку ў тэроры

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Па акрузе вылўлен рад выпадкаў кулацкага тэрору. У вёсцы Шабош, Любаньскага раёну, група кулакоў, пад кіраўніцтвам былога памешчыка Забелы, сарвала культурны вечар і зьбіла ўдзельнікаў. Нядаўна кулакі зьбілі настаўніка Аўгусьцінскага, які праводзіў актыўную савецкую работу.

У в. Зрудзічы, Парыцкага раёну, ад падпалу зьнішчана гумно члена сельсавету Дразда, які выступаў супроць кулакоў. У Нова-Максімаўскім сельсавеце, Клічаўскага раёну, кулакі паламалі малады сад і выгналі жывёлу з хлявоў старшыні сельсавету Букорава.

Усе злачынцы затрыманы. Беднякі і сераднякі акругі патрабуюць суровага пакараньня кулакоў-тэрарыстых.

ЗЬВЯЗДА

НА КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ

НЕДАХОПЫ СПАБОРНІЦТВА ПАД АБСТРЭЛАМ МАС

Бюракратызму асобных працаўнікоў трэба даць „ударны" адпор

Пры дапамозе бальшавіцкай самакрытыкі выканаем задачы другога году пяцігодкі

Займаюцца ўсім, толькі не спаборніцтвам

42 чал. выступілі ў спрэчках па дакладу т. Розіна. 42 чал. расказалі шмат цікавага аб адносінах заводзкіх арганізацый да сацыялістычнага спаборніцтва наогул і ў прыватнасьці да ўдарных брыгад.

Крытыка азносін асобных гаспадарнікаў да сацспаборніцтва насіла даволі дзелавы і канкрэтны характар.

Вось, напрыклад, адміністрацыя бойні.—«Наставіўшы каўнэр, а рукі залажыўшы ў рукавы, ходзіць адміністратар па дварэ і хоць-бы яго што-небудзь цікавіла»,—расказвае рабочы т. Лунін.

Тав. Лунін хацеў-бы падаць лічбы сацыялістычнага спаборніцтва на бойні, але, пажаль, адміністрацыя не вядзе вучоту спаборніцтва, і ніхто з рабочых ня ведае, як спраўляюцца ўдарнікі са сваімі задачамі.

Для адміністрацыі бойні арганізацыя ўдарных брыгад наогул была справай нечаканай. Рабочыя прышлі раніцою на работу і абвясьцілі майстру: «Мы арганізавалі ўдарную брыгаду».—«Якую брыгаду?»—са зьдзіўленьнем запытаўся май стар. За сваю ініцыятыву рабочыя-ўдарнікі атрымалі мянушку «балахоўцы».

Рабочыя бойні ня ведаюць таксама аб сваім прамфінпляне. Калі адзін рабочы пацікавіўся, ці ёсьць на прадпрыемстве прамфінплян, аказалася, што плян спакойна ляжыць у шафе. На прадпрыемстве шмат вытворчых недахопаў.

У Амэрыцы,—расказвае т. Кацнэльсон,—жывёла перад тым, як трапіць на бойню, купаецца ў басэйне вады, каб мяса было чыстае, а ў нас жывёла купаецца ў басэйне бруду. А потым пайшчыкі скардзяцца, што мяса ў крамах ЦРК бруднае.

Адміністрацыя-ж глуха да прапаноў рабочых.

Бюракратызм заводзкіх арганізацый фармазаводу прывёў да таго, што арганізаваная ударная брыгада па ініцыятыве беспартыйных рабочых развалілася (т. Пік).

Шмат недарэчнасьцяй у тарыфнай рабоце заводзкіх арганізацый. Адміністрацыя гуты імя Домбаля пачала рэгуляваць расцэнкі бяз удзелу саміх рабочых. Таму частка рабочых нават пакінула работу (тав. Казлоўскі).

Адміністрацыя-ж глухая да прапаноў таргуецца з рабочымі, на колькі процантаў павысіць ім норму выпрацоўкі. Між тым, такое пытаньне павінна было прайсьці праз заўком, вытворчую камісію і г. д.

Былі скаргі і на адносіны трэсталя да пытаньняў забесьпячэньня заводаў сырцом. Становішча з сырцом на заводзе «Камунар» напружанае, а мэталятрэст абмяжоўваецца абяцанкамі (т. Пілітовіч).

Дырэктар Лесбелу т. Дваранцкі, які выступіў у спрэчках, прызнаў, што яшчэ ня ўсе нашы гаспадарнікі пераключыліся на сацыялістычнае спаборніцтва. Ёсьць дырэктывы,—кажа т. Дваранцкі,—якія ўсім займаюцца, усім цікавяцца, толькі не сацыялістычным спаборніцтвам.

Спэцыялістыя не павінны адставаць

Ня мала гаварылася аб удзеле спэцыялістых у спаборніцтве. Гаварылі аб тым, што ёсьць асобныя старыя інжынэры, якія ня ўмешваюцца ў спаборніцтва, ёсьць нават такія, якія варожа адносяцца да ўсякай добрай справы на прадпрыемстве.

Але побач з гэтым ёсьць шмат фактаў сумленных адносін і зацікаўленасьці спаборніцтвам з боку спэцыялістых. Так, на «Эльводзе» спэцыялістыя ўзялі на сябе абавязак павысіць кваліфікацыю групы рабочых у 28 чалавек. Тое-ж самае на гуце «Пралетары». Дырэктар Страмтрэсту т. Мар'ясін расказвае, як на аднэй з цагелень малады тэхнічны працаўнік 2 тыдні рабіў досьледы над работай печы, не распранаючыся.

Асноўная маса спэцыялістых прымае ўдзел у спаборніцтве, можа ня досыць актыўна, але ў гэтым больш вінаваты інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі, якія амаль гэтым не кіравалі.

Праўда, ёсьць выпадкі, калі спэцыялістыя, падпісаўшы дагавор, ня выконваюць сваіх абавязкаў. Такі выпадак,—паводле слоў дэлегаткі т. Соркіной,—быў і на фабрыцы «Чырвоны Тэкстыльшчык».

Інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі павінны ўзмацніць кіраўніцтва інжынэрнай масай і ўцягнуць яе ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва.



Ударнікі хлебазаводу ў Менску за работай

Як кіруюць прафарганізацыі

Вельмі слаба. Калі на бойні арганізавалася першая ўдарная брыгада, многія актыўныя рабочыя былі супроць яе, бо ніхто ім не растлумачыў значэньня і ролі ўдарных брыгад (т. Лунін). Зразумела, што ў гэтым вінавата прафарганізацыя, якая ў даным выпадку (як і ва многіх падобных) цягнулася ў хвосьце рабочых мас.

Дэлегаты расказвалі аб многіх такіх кутках, дзе і зараз ня ведаюць, што такое ўдарная брыгада (т. Ванюшкіна і інш.).

Ёсьць і арганізацыйная блытаніна ў стварэньні ўдарных брыгад.

— Ні прафсаюз, ні вытворчая камісія ня ведаюць, як і якую работу весьці з ударнай брыгадай,—кажа тэкстыльшчыца т. Соркіна.

— Ударнікі нічога ня ведаюць аб сваіх функцыях,—заяўляе т. Пік з фармазаводу.—Калі ўдарнікі стараюцца падняць прадукцыйнасьць працы, іх абвінавачваюць у «рвацтве», бо яны гэтым самым павялічваюць сваю заработную плату. А заўком нічога ня робіць, каб растлумачыць рабочым, а таксама адміністрацыі значэньне ўдарных брыгад.

На швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» ударныя брыгады ўзялі на сябе рад абавязкаў па лепшай арганізацыі вытворчасьці, па зьніжэньні прагулаў, эканоміі матар'ялу і г. д. Але гэтыя абавязкі якраз супадаюць з абавязкамі вытворчай камісіі. Такім чынам, наглядаецца роўналежнасьць у рабоце (т. Палтэр).

Мала ўвагі ўдзяляецца вынаходніцтву (т. Пілітовіч з заводу «Камунар»). Ня больш увагі ўдзяляецца вылучэнству (т. Лунін з бойні). Часамі пасылаюць пекара на загатоўку жывёлы...

На шчотачнай фабрыцы,—паводле слоў тав. Кругліка,—фабком ніякага ўдзелу ня прыняў у арганізацыі ўдарных брыгад. На бойні адбыўся толькі адзін сход, прысьвечаны ўдарным брыгадам.

Прафэсыянальная праца на бойні так дрэнна наладжана, што нават пасылка дэлегатаў ударнікаў адбылася бяз ведама саміх ударнікаў. Для некаторых атрыманьне мандатаў на канфэрэнцыю зьявілася «Амэрыкай» (т. Кацнэльсон).

30-га лістапада павінна была адбыцца канфэрэнцыя мэталістых для заключэньня новага дагавору па сацыялістычным спаборніцтве. Але замест 300 чал. зьявілася ня больш 100 чал. Зразумела, канфэрэнцыя была сарвана. Тав. Пілітовіч з заводу «Камунар» правільна тлумачыць гэта тым, што прафэсыянальная арганізацыя не правяла належнай падрыхтоўкі.

***

Зусім правільна адзначыў і т. Дворкінд з цагельні № 3:

— Канфэрэнцыя,—сказаў ён,—зьявілася добрым уколам супроць соннай хваробы некаторых заводзкіх «трыкутнікаў».

Трэба спадзявацца, што канфэрэнцыя зробіць некаторы ўплыў на заводзкія арганізацыі і прымусіць іх зьмяніць мэтады сваёй работы. Толькі тады, калі ў спаборніцтве прымуць удзел усе рабочыя і служачыя нашых прадпрыемстваў, пачынаючы ад вартаўніка і канчаючы дырэктарамі і спэцыялістымі, сацыялістычнае спаборніцтва і работа ўдарных брыгад будуць мець патрэбныя вынікі.

Заключнае слова тав. Розіна

Па майму дакладу, — кажа тав. Розін, — выказалася звыш 40 дэлегатаў канфэрэнцыі. Большасьць з выступаўшых канкрэтнымі фактамі ілюстравала тыя недахопы, якія ёсьць у сацыялістычным спаборніцтве і ў рабоце ўдарных брыгад. Наша задача — улічыць усе гэтыя факты і намеціць мерапрыемствы для хутчэйшага зьнішчэньня недахопаў.

У чым асноўная задача ўдарнікаў? Ударная брыгада павінна зьявіцца пачынальнікам у выкананьні сацыялістычнага дагавору на прадпрыемстве. Брыгада павінна быць прыкладам для рабочых мас у справе павышэньня прадукцыйнасьці працы, узьняцьця працоўнай дысцыпліны, паляпшэньня якасьці прадукцыі, зьніжэньня сабекошту яе і г. д.

Гэтыя задачы ўдарнікі змогуць выканаць, калі будуць створаны адпаведныя спрыяючыя ўмовы для работы брыгад, калі партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі будуць аказваць максымальную дапамогу ўдарным брыгадам.

Нашы прафарганізацыі, на жаль, не навучыліся яшчэ падхапляць ініцыятыву рабочых мас. Мы маем рад фактаў (у спрэчках яны прыводзіліся), калі прафарганізацыі стаяць у баку ад сацыялістычнага спаборніцтва, абсалютна ня кіруюць ударнымі брыгадамі, яусім ня цікавяцца іх работай.

Тут былі два выступленьні, якія зьдзівілі мяне сваёй няшчырасьцю. Гэта — выступленьні т. т. Штэйнара (Скурсындыкат) і Фрэйдзіна (гарбарня «Бальшавік»). Гэтыя таварышы выступілі з рознымі абвінавачаньнямі супроць ударных брыгад, паказвалі толькі на хворыя бакі ў рабоце ўдарнікаў, але ні слова не сказалі аб дапамозе ўдарнікам з боку гаспадарчых арганізацый. А мы ведаем, што іменна скурсындыкат і гарбарня «Бальшавік» вельмі мала дапамагалі ўдарным брыгадам. Гэтыя арганізацыі мала клапаціліся аб забесьпячэньні ўдарных брыгад належнай колькасьцю сырцу, інструментамі і г. д.

Гаспадарнікі ня ўлічваюць часамі экана мічных вынікаў работы ўдарных брыгад. Між тым, гэта неабходна для пасьпяховай работы ўдарнікаў. Рабочыя павінны ведаць вынікі работы ўдарных брыгад, каб яны маглі ўпэўніцца ў каштоўнасьці іх. Трэба, каб заводзкія і фабрычныя кіраўніцтвы вывешвалі на відным месцы дасягненьні ўдарнікаў.

Некалькі слоў адносна выступленьня старшыні інжынэрна - тэхнічнай сэкцыі тав. Каплана. Ён імкнуўся ўсю віну за недахопы ўдарнікаў усклясьці на прафарганізацыі, вытворчыя камісіі і г. д.

Тав. Каплан ні слова не сказаў аб слабым удзеле ў сацыялістычным спаборніцтве з боку інжынэраў. Сярод старых інжынэраў, якія ў асноўнай масе прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве, ёсьць група варожых нам і нашаму будаўніцтву. Гэту групу, варожую нам, мы ня думаем уцягваць у сацыялістычнае спаборніцтва. Тым-жа, якія будуць перашкаджаць нашай рабоце, мы моцна дамо па руках. Але галоўную частку інжынэраў, асабліва маладых савецкіх спэцыялістых, якія заўсёды гатовы дапамагчы нашаму будаўніцтву, мы павінны і будзем значна больш прыцягваць да ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

Слаба праходзіць сацыялістычнае спаборніцтва ў саўгасах. Характэрна, што некаторыя саўгасы нават не выбіралі дэлегатаў на нашу канфэрэнцыю, а проста прыслалі іх у парадку вылучэньня.

Ударныя брыгады ў саўгасах працуюць слаба. Нам трэба перанесьці практыку сацспаборніцтва ў калгасы і саўгасы. Трэба шырока разгарнуць работу па ўцягненьні ў спаборніцтва рабочых саўгасаў і калгасьнікаў.

Рабочая каапэрацыя не прыстасавалася яшчэ да абслугоўваньня рабочага спажыўца. Гэта, бязумоўна, ня можа не адбіцца на ходзе сацыялістычнага спаборніцтва. Я думаю, што мы павінны выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва нашу каапэрацыю. Дагэтуль мы яшчэ ня маем такіх фактаў, каб той ці іншы рабочы калектыў выклікаў на спаборніцтва МІРК на лепшае абслугоўваньне пайшчыка.

Пасьпяховасьць сацыялістычнага спаборніцтва і работы ўдарных брыгад будзе залежаць ад разгортваньня самакрытыкі на фабрыках і заводах. Чым шырэй будзе разгорнута крытыка і самакрытыка, тым лепш будзе працаваць ударная брыгада, тым хутчэй завод выканае ўзятыя на сябе абавязкі па сацыялістычным дагаворы.

Што ўхваліла канфэрэнцыя

Канфэрэнцыя ўхваліла рэзалюцыю па дакладу тав. СЛАВІНСКАГА, у якой адзначае, што рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, наперакор ныцікам і малаверам з правага апартуністычнага лягеру, з посьпехам будуе сацыялізм, узмацняе пазыцыі пралетарыяту, з посьпехам наступае на капіталістычныя элемэнты.

«Акруговая канфэрэнцыя, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — ад імя авангарду сацыялістычнага спаборніцтва, ад імя ўсіх перадавых байцоў сацыялістычнага будаўніцтва ў Менскай акрузе, заклікае ўсіх рабочых да рашучай барацьбы на фабрыках і заводах, на чыгунцы і ў саўгасах супроць шкоднікаў, рвачоў, хвасьцістых і падкулачнікаў, супроць усякіх дэзарганізатараў сацыялістычнай вытворчасьці».

У рэзалюцыі па дакладу тав. РОЗІНА канфэрэнцыя намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў па зьнішчэньні недахопаў у рабоце ўдарных брыгад. Канфэрэнцыя адзначыла, што ня ўсе прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі ў поўнай меры ўцямілі вялікае значэньне ўздыму працоўнага энтузіязму мас. Большасьць гаспадарнікаў стаяла ў баку сацыялістычнага спаборніцтва. Канфэрэнцыя застрэльвае ўвагу прафсыянальных і гаспадарчых арганізацый на необходнасьці сталага кіраўніцтва і дапамогі ўдарным брыгадам. Канфэрэнцыя пастанавіла «рашуча і бязьлітасна змагацца супроць асобных спроб адсталых груп рабочых і варожых элемэнтаў утварыць для ўдарнікаў атмасфэру цкаваньня і ізаляцыі».

Вытворчыя камісіі і нарады, а таксама часовыя кантрольныя камісіі павінны накіраваць цэнтр увагі сваёй работы да практычнага ажыцьцяўленьня ўзятых на сябе рабочымі абавязацельстваў па сацыялістычным дагаворы. Асаблівая ўвага павінна быць аддана пытаньням утварэньня на прадпрыемствах і па трэстах фондаў прэміяваньня і правільнага іх выкарыстоўваньня.

«Ва ўсёй сыстэме культурна-масавай работы прафсаюзаў галоўнае месца павінна займаць прапаганда лёзунгу: «Тварам да вытворчасьці». Культкамісіі на прадпрыемствах павінны ўвязаць усю сваю работу з сацыялістычным спаборніцтвам. Насьценныя газэты павінны дапамагчы арганізаваць шырокую пралетарскую думку навакол сацыялістычнага спаборніцтва і работы ўдарных брыгад.

Канфэрэнцыя адзначыла абсалютную пасыўнасьць да сацыялістычнага спаборніцтва з боку інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу і даручыла ЦП саюзаў і інжынэрна - тэхнічнай сэкцыі прыняць належныя меры да ўцягненьня ў сацыялістычнае спаборніцтва інжынэрна-тэхнічнай сілы. ІТС разам з рабочым актывам павінна арганізаваць плянавую пэрыядычную праверку работы ячэек ІТС на прадпрыемствах і ступень удзелу кожнага інжынэра і тэхніка пасобку ў сацыялістычным спаборніцтве, ступень дапамогі іх ударным брыгадам.

Вытворчыя камісіі і таксама часовыя кантрольныя камісіі павінны накіраваць цэнтр увагі сваёй работы на ўдарнікоў і іншых рабочых, на гаспадарнікаў, якія нядбайна адносяцца да ўдарнікоў і ня выконваюць сваіх абавязкаў.

Канфэрэнцыя ўхвалила рэзалюцыю аб ударніках, у якой заклікае ўсіх рабочых, ударнікаў і ўдарніцтвы, ударныя брыгады, ударныя прадпрыемствы, ударныя гарады, ударныя раёны, ударныя вёскі, ударныя калгасы, ударныя саўгасы, ударныя ўстановы, ударныя школы, ударныя ВНУ, ударныя ВТУ, ударныя ВТС, ударныя ВТК, ударныя ВТА, ударныя ВТЭ, ударныя ВТЭС, ударныя ВТЭЦ, ударныя ВТЭЦС, ударныя ВТЭЦСС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССССС, ударныя ВТЭЦССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССССССССССССССССССССССССССССССССССССССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦССС, ударныя ВТЭЦСС

Перапіс дробнай прамысловасьці

З 15-га сьнежня 1929 г. па 1-е сакавіка 1930 г. будзе праводзіцца перапіс дробнай нацэнзавай прамысловасьці па БССР (цэнзавымі прадпрыемствамі лічацца такія, што маюць ня менш 16 рабочых пры адным рухавіку і ня менш 30 рабочых без рухавіка). Мэта перапісу — сабраць належныя статыстычныя матар'ялы, якія характарызуюць работу дробнай прамысловасьці, бо статыстыка да апошняга часу ня мела нават вестак аб ліку рабочых, якія працуюць у дробнай прамысловасьці, аб валавой прадукцыі і г. д. Пры адсутнасьці такіх асноўных паказальнікаў, зразумела, цяжка было выявіць сацыяльна - эканамічную структуру дробнай прамысловасьці.

Між тым, дробная прамысловасьць у сучасны момант зьяўляецца патрэбным дадаткам да буйной прамысловасьці і займае ў радзе вытворчых галін вельмі значнае месца, напрыклад, у швейнай, абутковай, сталярнай і інш. прамысловасьцях. Вялікае месца адведзена для дробнай прамысловасьці і ў пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР. Гадовая прадукцыя дробнай вытворчасьці паводле пяцігодкі павялічваецца на 34 проц. і дасягае, такім чынам, 216 міл. руб. Лік занятых рабочых па дробнай прамысловасьці дасягае да канца пяцігодкі 116 тыс. чалавек.

У задачы перапісу ўваходзіць вывучэньне сацыяльна - эканамічнай структуры дробнае прамысловасьці, выяўленьне працэсаў аграмаджаньня, у прыватнасьці вывучэньне дзейнасьці кааперацыі, вывучэньне ролі прыватнага капіталу, высьвятленьне сувязі дробнай прамысловасьці з сельскай гаспадаркай і г. д.

Вырашэньне ўсіх гэтых складаных задач патрабуе максымальнай напружанасьці з боку статыстычных органаў. Пытаньнямі гэтага перапісу павінны таксама зацікавіцца як савецкія ўстановы, так і грамадзкія арганізацыі. Толькі пры іх удзеле і падтрыманьні гэта работа будзе выканана з посьпехам.

Д. ВАГЕР.

Антысэміты ў рабачкоме пабудовы с.-г. выстаўкі

Старшыня і сакратар рабачкому зьняты з работы

Адказны сакратар рабачкому пабудовы беларускай с.-г. выстаўкі **Мядзьведзеў** дапусьціў антысэміцкі ўчынак у адносінах рабочага яўрэя **Лібовіча**.

Рабачком пабудовы вывеў Мядзьведзева са складу рабачкому. Калі пытаньне гэта было пастаўлена на абгаварэньне агульнага сходу рабочых пабудовы выстаўкі, старшыня рабачкому тав. Мінін выступіў з прамовай, у якой заявіў, што лічыць вывад Мядзьведзева з рабачкому няправільным і калі Мядзьведзеў будзе выведзен, дык ён пакіне работу ў рабачкоме. Агульны сход пастанавіў абмежавацца толькі суровай вымовай Мядзьведзеву.

Прэзыдыум ЦП саюзу будаўнікоў, разгледзеўшы гэтае пытаньне, прызнаў, што старшыня рабачкому Мінін сваім выступленьнем у абарону антысэміцкага ўчынку адказнага сакратара рабачкому Мядзьведзева імкнуўся замазаць палітычны зьмест гэтага ўчынку, карыстаючыся тым, што на пабудове большасьць рабочых зьяўляецца сэзоньнікамі з нізкім культурным узроўнем.

Прэзыдыум ЦП прызнаў немагчымым пакінуць т. Мініна на рабоце ў рабачкоме, зьняў яго з гэтай працы і абвясьціў яму суровую вымову. Пацьверджана пастанова рабачкому аб вывадзе Мядзьведзева з яго складу.

Пастанова агульнага сходу рабочых выкліканая недапушчальным выступленьнем Мініна, скасавана.

Перавыбары кіруючых арганізацый Чырвонага Крыжу

У хуткім часе распачынаюцца перавыбары кіруючых арганізацый Чырвонага Крыжу на мясцох. Асноўнымі момантамі перавыбарчай кампаніі, на якіх патрэбна спыніцца, зьяўляюцца наступныя: як разгорнута і праводзіцца сацыялістычнае спаборніцтва і самакрытыка ў арганізацыях Чырвонага Крыжу; які ўдзел прымалі арганізацыі Чырвонага Крыжу ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі; што зроблена для ліквідацыі санітарнай няпісьменнасьці і санітарнай падрыхтоўкі сярод сялянства; што зроблена па паляпшэньні быту працоўных (пабудова студняў, лазьняў, плацовак і інш.) у калгасах, камунах і арцелях; як праводзіцца ўцягненьне жанчын у вайскова-санітарную падрыхтоўку; як праходзіць збор сродкаў на пабудову санітарнага самалёту і якія ёсьць дасягненьні ў гэтай працы.

Усе гэтыя пытаньні павінны заняць важнае месца ў перавыбарчай кампаніі Чырвонага Крыжу. Трэба таксама зьвярнуць увагу на выкананьне пяцігадовага пляну разьвіцьця арганізацый Чырвонага Крыжу ў БССР.

Толькі пры актыўным удзеле самых пырокіх працоўных мас, пры актыўным абгаварэньні на сходах усіх гэтых пытаньняў можа быць забясьпечаны добры склад новых кіруючых органаў Чырвонага Крыжу.

І. Р—КАЎ.

УСІМ ЯЧЭЙКАМ МОПР'у.

5-га сьнежня, а 11 гадз. дню, хуткім цягнікам прыяжджае ў Менск тав. ЛАНЦУЦКІ. Прэзыдыум Менскага АК МОПР'у запрашае ўсе ячэйкі МОПР'у

прыняць удзел у сустрэчы т. ЛАНЦУЦКАГА,

шляхам выдучэньня дэлегацый па 5-10 чал. Дэлегацыям сабрацца ў памяшканьні Акругкому МОПР'у к 10 гадз. раніцы (Савецкая, 87).

Прэзыдыум Мен. АК МОПР.

Кіно „КУЛЬТУРА".

У чацьвер, 5-га сьнежня, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні Дому Культуры склікаецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ МІТЫНГ ЧЛЕНАЎ МОПР'у сумесна з прафактывам

НА МІТЫНГУ ВЫСТУПІЦЬ ПРЫБЫВАЮЧЫ Ў МЕНСК **тав. ЛАНЦУЦКІ.**

Білеты выдаюцца ячэйкамі МОПР'у ў райкомах МОПР 4-XII з 7 да 9 гадз. увечары, а ў дзень мітынгу ў Акругкоме МОПР з 9 гадз. да 4 з пал. дня.

Пасьля мітынгу—КІНО.

МЕН. АК МОПР.

МЕНСК

Да прыезду ў Менск тав. Ланцуцкага

5-га сьнежня ў Менск прыяжджае тав. Ланцуцкі, якому акругком МОПР'у наладжвае на вакзале ўрачыстае спатканьне. Будучы ў Менску, тав. Ланцуцкі выступіць на агульна-гарадзкой канфэрэнцыі піянэраў і школьнікаў мопраўцаў, якая адбудзецца 7 і 8 сьнежня ў клюбе Камасьветы імя Карла Маркса.

Каштоўныя паклады ў ваколіцах Менску

Дасьледчая партыя горнага аддзелу ВСНГ, якая вяла дасьледчую работу ў Крущах (4 вярсты ад Менску) выявіла значныя запасы каштоўных мэргеляў і глін, якія годны для вырабу кафлі, жоўтай цэглы і інш. керамічных прадметаў. Намечана ў гэтым раёне пабудаваць керамічны камбінат.

Радыё ў рабочыя кватэры

Канчаткова ўстаноўлены парадак радыёфікацыі кватэр менскіх рабочых. Па ўсім горадзе будзе радыёфікавана каля 3.000 кватэр і чырвоных куткоў. Кожны рабочы і служачы, які жадае правесьці ў сваю кватэру радыё, павінен запісацца праз фабком у саюзны сьпіс. Растэрміноўка платы за абсталяваньне радыё ўстаноўлена ад 3 да 15 месяцаў, у залежнасьці ад разьмеру пэнсіі.

Горныя курсы ў Менску

Горны аддзел ВСНГ, у сувязі з недахватам спэцыялістых - гарнякоў пастанавіў адкрыць у Менску 2-х-гадовыя вячэрнія курсы па падрыхтоўцы горных тэхнікаў на 50 чалавек. Акрамя гэтага, у будучым годзе адкрываецца горнае аддзяленьне в 3-х гадовым курсам навучаньня пры Менскім політэхнікуме.

Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых для Біра-Біджану

Учора ў Менск прыехаў адказны сакратар Камвету СССР т. Тэўмін. Тав. Тэўмін прыняў удзел у нарадзе па пытаньні аб падрыхтоўцы кадраў кваліфікаваных рабочых для Біра-Біджану.

У Біра-Біджане Зернатрэст арганізуе некалькі буйных саўгасаў. Адзін саўгас на 80 тысяч гэктараў ужо арганізаваны. Для забясьпячэньня гэтых саўгасаў кваліфікаваная рабочая сілай у Беларусі намечана адкрыць курсы на 150 трактарыстых і мэліяратараў. У самым Біра-Біджане арганізаваны трактарныя курсы на 300 чалавек. БССР прадстаўлена на гэтых курсах 50 месц.

Нарада намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы патрэбных для Біра-Біджану кадраў.

Беларуская дэлегацыя на ўсесаюзны зьезд ударных брыгад

Сёньня выяжджае з Менску беларуская дэлегацыя на Ўсесаюзны зьезд ударных брыгад, які адкрываецца ў Маскве 5-га сьнежня. У дэлегацыю ўваходзіць 11 рабочых найбольш буйных прадпрыемстваў БССР—гарбарня «Бальшавік», фабрыка «Чырвоная Бярэзіна», Менскіх чыгуначных майстэрань, фабрык запалак «Вэзувій», «Дняпро», друкарні «Палесдрук» (Гомельшчына)), Асінбуду і іншых. Сярод дэлегатаў 6 ударнікаў, рэшта—старшыні вытворчых і кантрольных камісій. У ліку дэлегатаў 2 работніцы.

Перавыбары саветаў адкладваюцца

Прэзыдыум ЦВК БССР на аснове пастановы прэзыдыуму ЦВК СССР пастанавіў адкласьці перавыбары саветаў па Беларусі.

Першая ў БССР футравая фабрыка

Белдзяржгандаль пастанавіў у бягучым годзе прыступіць да пабудовы ў Менску першай у БССР футравай фабрыкі. Пабудова фабрыкі абыйдзецца ў 500.000 рублёў і будзе закончана яшчэ ў лістападзе 1930 году.

Праект пабудовы фабрыкі падрыхтаваны спэцыялістым інжынэрам Барысавым. Усе працэсы работы на фабрыцы будуць мэханізаваны.

СПОРТ

Нарада інструктароў фізкультуры. Адбылася нарада інструктароў фізкультуры гор. Менску па пытаньні ваяніізацыі фізкультурнай працы ў школах і гуртках. Нарада пастанавіла прасіць акр. савет фізкультуры распрацаваць канкрэтную праграму ваяніізацыі фізкультурных заняткаў.

Рабочыя фізкультурныя брыгады. Акр. савет фізкультуры пастанавіў арганізаваць у цэлым радзе мястэчак Меншчыны фізкультурныя рабочыя брыгады. Мэта фізкультурных рабочых брыгад дапамагаць наладжаньню фізкультурнай работы і прымаць удзел у розных палітычных кампаніях на вёсцы. Такія брыгады будуць арганізаваны ў м. Капылі, Пухавічах, Чэрвені і Смалявічах.

Курсы па фізкультуры. 15 сьнежня адкрываюцца курсы для раённых працаўнікоў па пытаньні аб новых формах фізкультурнай работы. Курсы будуць працаваць тры дні. У іх будуць прымаць удзел 20 чалавек.

„Пастухамі прыехалі--пастухамі і паедзеце"

Курсанты батрацка-бядняцкіх курсаў жывуць у 1-й Савецкай гасьцініцы па Камсамольскай вул. 8 першага дня, як пачалі працаваць курсы, абслугоўваючы пэрсанал гасьцініцы вельмі дрэнна абыходзіцца з курсантамі. Па некалькі дзён не апальваюць памяшканьня ня ўбіраюць пакояў. На працягу цэлага месяца не зьмяняюць пасьцельнай бялізны. У некаторых пакоях паламаныя ўмывальнікі, печкі дымяць, быў выпадак, калі прыбіральшчыца Вайсвэля аблаяла курсанта сьвінапасам, мужыком і г. д. Яна сказала: «прыехалі пастухамі і паедзеце пастухамі». Трэба адзначыць, што такое абыходжаньне ў 1-й Савецкай гасьцініцы нагляданецца толькі ў адносінах да курсантаў. Тыя-ж пакоі, дзе жывуць ня курсанты, утрымліваюцца добра.

Просім прыняць самыя рашучыя меры да зьнішчэньня такога дрэннага абыходжаньня з намі.

28 подпісаў.

Сходы беднаты ня склікаюцца

Сьмілаўшчына падыйшла да масавай калектывізацыі, але бедната яшчэ ня ўся цалкам ідзе ў калгасы. Некаторыя з беднякоў вераць кулацкім выдумкам, якія вельмі пашыраны ў вёсках раёну.

Беднату, якая ўступае ў калгасы, кулацтва запалохвае розьнымі спосабамі. У Раўнапольі калгасьніку Людчыку Алесю пабілі вокны. У ініцыятара калгасу «Новы Шлях» кулакі падпалілі гумно.

Бедната вёсак хоча ісьці ў калгасы, але часта баіцца. Работа-ж з ёю не праводзіцца. Нават калі праводзіліся сходы па вёсках аб арганізацыі калектыву, ня склікаліся сходы беднаты. Беднату не выбіралі ў паказальныя калгасы на агляд работы.

Такія адносіны прыводзілі беднату да таго, што яна некалькі раз уступала ў калгасы, а потым зноў выходзіла.

Л.

ЗА 30-ТЫСЯЧНЫ ТЫРАЖ „ЗЬВЯЗДЫ"

НІ АДНАГО ПАРТЫЙЦА, ЯКІ-Б НЯ ВЫПІСВАЎ „ЗЬВЯЗДЫ"

„Таксама я хачу некалькі слоў сказаць аб нашай „Зьвязьдзе". Яе роля ў самакрытыцы вялізная. Яна ня кепска яе разгортвае. У сувязі з пастановамі пленуму, трэба думаць, яна робіць самакрытыку яшчэ больш баявой, якая мацней б'е правага ўхілістага, бюракрата. Трэба больш дапамагаць газэце ў яе рабоце. Трэба значна павялічыць яе тыраж. Трэба падтрымаць пачынаньне Добруша аб выкліку на падпіску на „Зьвязду". Кожны член КП(б)Б павінен выпісваць „Зьвязду"—цэнтральны орган КП(б)Б, павінен дапамагаць ёй у яе рабоце".

(З дакладу т. Гамарніка аб пленуме ЦК КП(б)Б на сходзе Менскага партактыву).

АКРУГКОМЫ і РАЙКОМЫ КП(б)Б!

Што зроблена вамі па разгортваньні кампаніі падпіскі на ЦО КП(б)Б газэту „ЗЬВЯЗДА"?

Ці прыняла ваша арганізацыя выклік дабрушан?

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ! Колькі партыйцаў на вашым прадпрыемстве падпісаліся на „ЗЬВЯЗДУ"?

Колькі беспартыйных рабочых і служачых вамі завербавана падпісчыкамі „ЗЬВЯЗДЫ"?

Калгасы не забясьпечаны ад пажараў

У калгасах няма супроць пажарнага інвэнтару

Калектывізацыя Зеляноцкага і Ліпаўскага сельсаветаў (Калінкавіцкі р-н, Мазырчына) ахапіла 60 проц. сялянскіх гаспадарак; а ў Даманаўскім сельсавеце калектывізавана 70 проц. Калінкавіцкі РВК спадзяецца, што ў веснавую пасеўную кампанію калектывізацыя будзе праведзена на ўсе 100 проц.

У калгасах-гігантах ужо зараз пабудаваны вялізарныя будынкі, у якіх знаходзіцца ўся калгасная маемасьць.

Як-жа ахоўваюцца гэтыя будынкі ад пажарнай небясьпекі? Ці падумаў хтонебудзь аб тым, што ў часе ўзмоцненай клясавай барацьбы на вёсцы, кулацтва ўжывае ўсе спосабы і мэтады для таго, каб пашкодзіць сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі.

Не, аб гэтым ніхто ня думае, ніхто не гаворыць і ніхто ня піша.

Хто-ж павінен турбавацца пра пажарную небясьпеку?

У першую чаргу Калгассаюз і пажарная інспэкцыя. Гэта яны павінны былі выпісаць калгасам хаця-б па адной пажарнай машыне, гэта яны павінны паклапаціцца аб арганізацыі спэцыяльных пажарных камэнд у буйных калгасах.

Праўда, Калінкавіцкі гарадзкі савет арганізаваў ударную брыгаду з 36 асобных пажарнікаў і накіраваў іх у буйнейшыя калгасы Даманаўскага сельсавету. Але гэтыя брыгады далёка не адвольваюць тых патрэб, якія адчуваюцца ў глухой адсталай Мазыршчыне. Праўда, брыгада ўжо арганізавала ў некалькіх калгасах пажарныя дружыны, але-ж ці можна з голымі рукамі заяваць з агнём. Калгассаюз і Мазырская пажарная інспэкцыя павінны зараз-жа паклапаціцца аб забясьпячэньні калгасаў пажарнымі машынамі.

БРЫГАДЗІР

СУД

Хуліганы з менскай акраіны

Увосень гэтага году, калі Андрэй і Анэля Кульганавы варочаліся з гораду дамоў на акраіну, у Бранілаўскім завулку іх спаткаў град каменьняў. Кампанія хуліганаў у складзе Крыштаносава, Раманоўскага і трох братоў Манькоўскіх, закончыўшы «артылерыйскую падрыхтоўку», перайшла да адкрытых «вайсковых дзеяньняў» супроць Кульганавых, пачала іх зьбіваць без усялякіх прычын. Хуліганы нанесьлі сваім ахвярам такія цяжкія параненьні, што іх прышлося ў карэце хуткай дапамогі адправіць у больніцу.

Польская нац. камэра г. Менску прыгаварыла хуліганаў братоў Манькоўскіх да паўтара года пазбаўленьня волі, а Крыштановіча і Раманоўскага да 1 году зьняволеньня.

А.

Зьверскае забойства

Глуханямыя Іванкоў і Стаўрова (м. Ціхінічы, Бабр. акр.), прышоўшы ў госьці да сваіх знаёмых Нюрэнбург і Плоткінай у часе папойкі задушылі іх; забралі розныя рэчы і грошы. Каб захаваць сьляды злачынства, Іванкоў і Стаўрова занесьлі трупы забітых у склеп, аблілі іх газаю і запалілі.

Вабруйскі акрсуд прыгаварыў забойцаў на 5 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем выбарчых праў на 3 гады.

Акрсуд замазаў справу Бэскіна і Хануціна

Яшчэ ў сьнежні месяцы 1928 году была выкрыта махінацыя ў магазыне № 23 гатовага адзеньня (Менск). Рэвізійная камісія ўстанавіла, што цэны на гатовае адзеньне значна былі павышаны. Так, паліто, коштам у 56 р. 55 к., прадавалася за 61 руб. 55 кап., іншыя польты прадаваліся па 52 р. 85 к. замест 46 р. 20 кап. Між іншым, былі выкрыты 52 штукі адзеньня без цаны і г. д. Прадстаўнік МІРК Бэскін на такія факты не рэагаваў і ня склаў патрэбнага акту. Рэвіз. камісія ад 30 сакавіка пастанавіла зьняць з працы Бэскіна і Хануціна.

Справа была перадана ў акрсуд 1-га вучастку. 17-га верасьня 1929 году разглядалася гэта справа, але акрсуд не знайшоў злачынства, ня гледзячы на тое, што 13 верасьня ў акрсуд быў паданы дадатковы матар'ял з РСІ. Акрсуд гэтага матар'ялу не разгледзеў і такім парадкам замазаў справу. Яшчэ да апошняга часу не разгледжана гэта справа, а злачынцы і зараз працуюць у іншых магазынах.

М.

Суботнік на карысьць МОПР'у

Рабочыя фабрыкі «Камінтэрн» (Барысаў) пастанавілі наладзіць суботнік на карысьць МОПР'у. Заробленыя за гэты дзень грошы ў суме 1.000 руб. будуць пераданы мопраўскім арганізацыям для дапамогі рабочым, якія томяцца ў капіталістычных турмах.

Радыё-перадача

Серада, 4-га сьнежня

17-00—Сялянская радыё-газэта (з яўрейск. аддз.).
18-00—Рабоча-сялянскі унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з польск. аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Беларускі батрак.
20-30—Камсамольскія перадачы.
21-00—Навуковая лекцыя; тэхніка масам.
21-30—Гістарычны канцэрт.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Дом Камасьветы. Сёньня 19 г. інструкцыйны даклад тав. **Фэйгельсона** для вылучаных РК дакладчыкаў аб лістападаўскім пленуме.

Дом Асьветы. Дармовае кіно для чл. Дому з 19 і 21 гадз., шахм. шап. гурток у 20 гадз.

Кастрычн. РК МОПР'у выклікае на 19 гадз. сакратароў і старш. ячэек Мопр'у: зав. «Энэргія», «Бальшавік», абутк. ф-кі, мясцкому № 3 пас., мэдфаку, шчацінная і шчотачн. фабрык, зав. «Чыр. Зара», ЦІП, Цэнтрасьпірту, п.-к. «Адраджэньня», т-ва саматужнікаў, Белсельсаюзу, дзевяцігодкі МББ.

Установчы сход літаратурнае сэкцыі нав. т-ва ваяўнічых матар'ялістых-дыялектыкаў у 18 гадз. у АПАД ЦК.

Запрашаюцца т.т. Секерская, Некрашэвіч, Мурашка, Галавач, Барашка, Бэндэ, Александровіч, Чарот, Гурскі, Міхайлаў, Красьнеўскі, Дунец, Валабрынскі, Вансоўскі, Сэрбэнта, Канакоцін, Вечар, Хведаровіч.

Пэдгабінэт. Сёньня: 1. Сход сэкцыі антырэлігійнага выхаваньня. Пачатак а 7 г. увеч. Парадак дня: Даклады 9 і 17 школ аб рабоце школьных гурткоў Юных Вязбожнікаў. Яўка членаў сэкцыі абавязкова. Запрашаецца настаўніцтва.

2. Заняткі гуртка на маляваньні для настаўнікаў 1 канцэнтру—8 гадз. увеч.
3. Заняткі пэдалёгічнага гуртка для дашкольніц у 8 гадз. увеч.
4. Канфэрэнцыя настаўнікаў «О» груп школ г .Менску ў 7 гадз. увечары па пытаньні аб дашкольным паходзе.

Сёньня, 4-XII а 6 гадз. увечары ў памяшканьні Акругкому МОПР'у (Савецкая, 87) адбудзецца нарада старшынь і членаў рэвізійных камісій Мопраўскіх ячэек Фрунзаўскага раёну.

Запрашаюцца ў абавязковым парадку члены рэвізійнай камісіі Фрунзаўскага Райкому МОПР'а і рэвізійныя камісіі ячэек МОПР'а Фрунзаўскага раёну.

ФРУНЗ. РКом МОПР'у.

ЗАЎТРА

Нарада брыгады, вызначанай жэнсэкцыяй Фрунз. РК МОПР'у для абсьледваньня жакт. яч.—у 17 гадз. (памяшк. АК МОПР'у).

Мопраўскім яч. за дакладчыкамі зьвяртацца ў АПАД райкому да тав. **Пятушкова** да 14 гадз. за тры дні да сходу.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

У сераду 4-га сьнежня, а 7-й гадз. увечары у Доме Працы (2-гі паверх, пакой № 2) адбудзецца

пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму Бел. МБТ.

У ПАРАДКУ ДНЯ СТАЯЦЬ НАСТУПНЫЯ ПЫТАНЬНІ:

1. Аб арганізацыі новага ВТУ (Дакл. НК Асьветы—садаклад т. Натансона).
2. Аб навучальным пляне вячэрніх рабочых тэхнікумаў (Дакл. НК Асьветы —садаклад тав. Масткова).

Запрашаюцца чл. бюро ІТС, навуковыя работнікі, чл. ІТС і прадстаўнікі ЦВПС.

ЦП саюзу саўгандальслужачых

паведамляе,

што СЁНЬНЯ, 4 сьнежня, а 7 гадз. увечары. у памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачых» адбудзецца

НАРАДА ПРАФАКТЫВУ

саюзу саўгандальслужачых г. Менску.

У парадку дня: Вынікі пленуму саюзу саўгандальслужачых і далейшыя задачы, якія стаяць перад нашым саюзам.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

ЧАЦЬВЕР, 5 сьнежня, **АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ.** Білеты ў рабочай касе і касе тэатру. А. Вэвюрка. **БОТВІН**

ПЯТНІЦА, 6-га сьнежня, **спэктакль для саюзу гарбароў.** Білеты па калектыўных заяўках у рабочай касе і ў касе тэатру. А. Кушнырэў. **Гірш Лекерт**

СУБОТА, 7-га сьнежня, **спэктакль для саюзу мэдсанпрацы.** Білеты ў саюзе. Ц. Даўгапольскі. **Барацьба машын**

НЯДЗЕЛЯ, 8 сьнежня, **спэктакль для фабкому швэйнай ф-кі „Кастрычнік"** Білеты ў фабкоме. Д. Бэргельсон. **ГЛУХІ**

Пачатак спэктакляў роўна а 8 г. 30 м.

КІНО-ТЭАТР **Культура** — **Рэйкі гудуць** Звыш праграмы хроніка Белдзяржкіно. Пасьля кожнага сэансу выступленьне **Е. ЛЬВОВАЙ І ДОРЫНА** Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса— ад 5 гадз.

КІНО **Пятэрбурскае** — Нямецкі фільм **Зялёны завулак** драма ў 6 частках. Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 65. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса--ад 5 г.

КІНО **Пралетарый** — Новы бытавы фільм вытворчасьці „совкино" **НА ЗАВАРОЦЕ** Драма ў 6 частках. Звыш праграмы амэрык. аргінальн. камэдыя **ЯНА--ГЭТА ЁН** у 2-х частках. Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр **„Юны Піянэр"** — Новы фільм савецкае вытворчасьці **МАНІФЭСТ** гістарычна-хронікальная карціна ў 5 частках. Звыш праграмы **ЦЁМНЫ КАНЁК** Амэрыканская камэдыя ў 2 частках. Каса адчыняна ад 2 гадз.

КІНО **СпартаК** — З панядзелка 2 сьнежня звыш праграмы гастролі сатырыкаў-шутоў **Е. І. Ю. Штукаровых** У рэпэртуары-юмар, сатыра злоба дня. На экране— мастацкі фільм **ЗАКОН ГОР** драма ў 8 час. Каса--ад 5 г. Пачатак 1 с. а 6 г. 30 м.

ТРЕБУЕТСЯ ВТОРОЙ ВРАЧ Ж.-Д. АМБУЛАТОРИИ ЖЛОБИН ЮЖНЫЙ.

Жалованье 100 р., раз'ездные 15—20 р. в месяц. Казенной квартиры нет. Поселиться обязательно в поселке вблизи амбулатории. Заявления до 15 декабря посылать заведующему 30 врачебным участком Жлобин Южный.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

Чырвонае Беларусь

МАЗЫРСКАМУ КАМТРЭСТУ ПАТРАБУЮЦЦА ЭЛЕКТРА-МАНЦЁРЫ якія ведаюць пераменны ток высокага напружаньня

для работы на электрастанцыі ў горадзе.

Кваліфікаваным манцёрам аклад па асобнай згодзе

Запытаньні накіроўваць у МАЗЫР, КАМТРЭСТ.

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодні. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца там: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў па чатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя марк.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, бяг. рахунак № 682. Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усекабанк, Завочным курсам.

50 к. Кошт публікацыі аб згубе даўкмантаў

ВЫДАВЕЦТВА ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР

Менск, Пляц Волі, 5, т. 2-84.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1930 год

на штомесячную паліт.-эканамічную часопісь

„САВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА"

5-ы год выданьня.

Часопісь удзяляе ўвагу пытаньням сацыялістычнага будаўніцтва і вывучэньню гаспадаркі і культуры БССР. Акрамя таго, у часопісі знаходзіць адбітак і эканамічнае жыцьцё суседніх краін.

Часопісь мае наступныя сталыя аддзелы:

1. Эканамічнае будаўніцтва і эканамічная палітыка. 2. Савецкае і культурнае будаўніцтва. 3. За рубяжом. 4. Па акругох. 5. Крытыка і бібліяграфія. 6. Хроніка. 7. Дынаміка народнай гаспадаркі БССР (стат. бюлетэнь).

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 3 мес.
7 руб. 50 к.	6 руб.	4 руб.	2 руб.

Для гадавых падпісчыкаў дапускаецца растэрміноўка: пры падпісцы—3 руб., да 1-га красавіка —2 руб. 50 к. і да 1-га ліпеня 2 руб.

Гадавыя падпісчыкі, якія ўнясуць цалкам падпісную плату да 15 студзеня 1930 г., атрымаюць бясплатна «Кантрольныя лічбы народнае гаспадаркі і культуры БССР на 1930/31 год».

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА бюро падпіскі Белдзяржвыдавецтва, контрагентцтвам друку, усімі п.-т. канторамі, газэтным бюро Менскай п.-т. канторы, упаўнаважанымі пры акрплянах і непасрэдна РВА Дзяржпляну.

Для здачы абвесткі ў газэту „ЗЬВЯЗДА" званецце па тэл. 7-81.

29-XI —29 г. **ЗГУБЛЕНА** круглая каўчуковая **ПЯЧАТКА** жлобінскага вучпрафсожу. Лічыць несапраўднай.

Абвешч. несапраўдн. дакументы на імя Патапчука Л. 1. 1) партбіл. № 0817510; 2) прафбілет саюзу тэкстыльшчыкаў № 1155313—знойдзены. Лічыць сапраўднымі.

Прыблудзіўся сабака шорсьці бурай з нашыйнікам. падобна на ваўка. Праз 3 дні лічу сваім. Адрас: ст. Фэнісоль, маёнтарацыя. Талочка В.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня